ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 255 5331
НЯДЗЕЛЯ
10
ЛІСТАПАДА
1935 г.
год выдання XVIII

Мільённыя масы рабочых, калгаснікаў, усіх працоўных Совецкага Саюза, рабочыя, калгаснікі і працоўныя ордэнаноснай БССР у дзень восемнаццатай гадавіны Вялікага Кастрычніка дэманстравалі велізарныя дасягненні і перамогі, атрыманыя імі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і любімага правадыра народаў таварыша СТАЛІНА, сваю бязмежную адданасць справе соцыялізма, сваю баявую гатоўнасць у любую мінуту стаць на абарону соцыялістычнай радзімы.

УПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

Восемнаццатая гадавіна Вялікай пролетарскай рэволюцыі ў СССР была адзначана магутнымі дэманстрацыямі рабочых, чырвонаармейцаў, калгаснікаў, совецкай інтэлігенцыі і ўсіх працоўных. Буйнейшыя пролетарскія цэнтры вялікага Совецкага Саюза — Масква, Ленінград, Кіеў, Харкаў, Свердлоўск, Ташкент, пролетарскі Данбас, аддаленыя раёны, сёлы, калгасы, заводы і фабрыкі, дамы — кожны куток нашай соцыялістычнай радзімы сустракаў з велізарнейшым уздымам і радасцю свята Кастрычніка.

Свята Кастрычніцкай рэволюцыі прайшло, як **сапраўды ўсенароднае свята.** З найвялікшым уздымам, радасцю, бурлівым вяселлем сустракалі Кастрычнік усе народы вялікага Совецкага Саюза. З найвялікшым уздымам, бурлівым вяселлем і радасцю, звонкімі песнямі і скокамі сустрэў восемнаццаты Кастрычнік і беларускі народ, народ перадавой ордэнаноснай рэспублікі.

Няма ў свеце ні адной улады, якая-б была так блізка працоўнаму народу, якая была-б самым кроўным чынам так цесна звязана з народам, якая была-б такой сапраўды народнай, якою з'яўляецца совецкая ўлада. Няма ў свеце ні адной краіны, апрача Совецкага Саюза, дзе народ будаваў-бы сваімі рукамі сваю будучыню, дзе-б з года ў год такімі небывалымі тэмпамі рос узровень матэрыяльнага добрабыту найшырэйшых працоўных мас, квітнела культура, бурна ўзнімалася ўся народная гаспадарка. І ўсё гэта дала толькі Вялікая пролетарская рэволюцыя, усё гэта дала дыктатура пролетарыята, пераможнае будаўніцтва соцыялізма. Вось чаму свята Кастрычніцкай рэволюцыі было сапраўды народным, яркім і радасным святам.

Грандыёзны перамогі соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя перамогі і дасягненні бачыць і адчувае кожны працоўны нашай краіны. Гэтыя перамогі і дасягненні — рэзультат мудрага кіраўніцтва геніяльнейшага чалавека нашай эпохі вялікага **Сталіна,** рэзультат адзіна правільнай ленінскай палітыкі партыі большэвікоў, партыі **Леніна—Сталіна.** Вось чаму шматтысячныя дэманстрацыі ва ўсіх гарадах Совецкага Саюза, святкаванні ва ўсіх гарадах, раёнах і калгасах Совецкай Беларусі прайшлі пад знакам **бязмежнай да большэвіцкай партыі, да натхніцеля і арганізатара перамог соцыялістычнага будаўніцтва, лепшага друга ўсіх працоўных Сталіна.**

«Дзякуй Сталіну за радаснае жыццё!» Гэты лозунг ярка гараў на сцягах рабочых і калгасных дэманстрацый.

«Дзякуй Сталіну за радаснае юнацтва!» Пад гэтым лозунгам ішлі калоны равеснікаў Кастрычніка, калоны нашай цудоўнай совецкай моладзі. І ўвесь беларускі народ у гэтыя дні зноў і зноў зварачаў свае мыслі і погляды да вялікага правадыра, настаўніка і друга беларускага народу — **Сталіна.**

Сталін — гэта сцяг нашай барацьбы, гэта наша непахісная воля да перамогі, гэта найвялікшая мудрасць ленінскай партыі, вакол якой жалезнымі згуртаванымі радамі ідуць мільёны працоўных.

Няма больш прыгнечанай і забітай калоніі царскага самадзяржаўя — старой Беларусі. Вырасла новая, Совецкая Беларусь, на чырвоных сцягах якой гарыць **ордэн Леніна.** Вырасла наша прамысловасць. Як найярчэйшы доказ поспехаў рабочага класа ў барацьбе за соцыялістычную прадукцыйнасць працы, уперадзе рабочых калон па праву ішлі стаханаўцы.

Стаханаўцы — гэта новыя людзі, якіх падняла партыя, якіх падняў з рабочых мас лозунг **Сталіна** аб аўладанні тэхнікай. Стаханаўцы—гэта тыя кадры, якія не баяцца труднасцей і ўмеюць перамагаць іх, якія з большэвіцкай настойлівасцю працуюць так, як гэтаму вучыць партыя, якія на справе даказваюць, што «тэхніка на чале з людзьмі, аўладаўшымі тэхнікай, можа і павінна даць цуды» **(Сталін).**

Растуць і мацнеюць нашы калгасы. Пад кіраўніцтвам партыі, уладаючы такой магутнай зброяй, як сталінскі статут, усё больш упэўнена ідуць калгаснікі да шчаслівага, багатага і культурнага жыцця, аб якім ніколі не мог марыць беларускі селянін. Зямля навекі замацавана за калгасамі. Паступова ўсё больш сціраецца процілегласць паміж горадам і вёскай. І найярчэйшым пацвярджэннем велізарнага палітычнага, гаспадарчага і культурнага росту калгаснага сялянства і бязмежнай адданасці калгаснікі святочныя калоны калгаснікаў-дэманстрантаў.

Свяшчэнны і недатыкальны граніцы Совецкага Саюза. Мы не хочам ні адной пядзі чужой зямлі, але ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому. Мы цвёрда вядзем палітыку міру, але ў любую мінуту гатовы даць сакрушальны адпор усякаму, хто пасягне на нашы граніцы, на нашу свяшчэнную зямлю.

Найвялікшай любоўю, увагай і клопатамі ўсіх працоўных, урада, партыі, вялікага **Сталіна** акружана наша Чырвоная армія. Выхаваная на вялікіх ідэях Маркса, Леніна, Сталіна, дасканала ўзброеная і аснашчоная Чырвоная армія пільна стаіць на варце нашых граніц на Захадзе і на Ўсходзе. Незлічоны рэзервы Чырвонай арміі—кожны працоўны гатоў стаць у яе рады, калі гэтага патрэбуе совецкая радзіма. І таму ў Кастрычніцкія дні з такой магутнасцю і ўпэўненасцю ў сваіх сілах прайшлі жалезнымі радамі калоны чырвоных байцоў, бліскуча асядлаўшых навейшую ваенную тэхніку. Узброены народ, які змагаецца за справу соцыялізма, непераможны.

Ва ўсім свеце, у сталіцах капіталістычных краін, пад гнётам фашызма—улады лютай, але нямоцнай, у далёкіх калоніях рабочыя і прыгнечаныя народы адзначалі гадавіну Вялікай пролетарскай рэволюцыі ў СССР, як магутны заклік да барацьбы за перамогу соцыялізма ва ўсім свеце, як вялікі сімвал надыходзячага вызвалення ўсяго чалавецтва.

Совецкая краіна ўступіла ў дзевятнаццаты год пролетарскай рэволюцыі. Рабочы клас, калгаснае сялянства і ўсе працоўныя нашай краіны вядзе ўперад вялікая і непераможная большэвіцкая партыя, вядзе найвялікшы геній чалавецтва — **Сталін.** Мы ўпэўнена ідзем да новых поспехаў і перамог, як-бы ні лютавалі вакол Совецкага Саюза фашысцкія грамілы—ланцужныя сабакі капіталізма.

Мы ўпэўнена глядзім у будучыню. Будучыня належыць рабочаму класу. Соцыялізм пераможа ва ўсім свеце, як перамог ужо на адной шостай зямнога шара.

Пад баявымі сцягамі Кастрычніка, пад сцягамі партыі **Леніна—Сталіна** ўперад, да новых перамог!

XVIII гадавіна Кастрычніцкай рэволюцыі ў Маскве

Парад на Краснай плошчы. На здымку: на ўрадавай трыбуне тт. КАЛІНІН, РУДЗУТАК, СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, ХРУШЧОЎ, АНДРЭЕЎ і МІКАЯН.

7 ЛІСТАПАДА Ў МАСКВЕ

МАСКВА, 9 лістапада. (БЕЛТА). З некалькіх бакоў падыходзяць да Краснай плошчы войскі. Манаўтнымі батальёнамі ўступаюць яны на ўсыпаную пяском брукчатку, выраўніваюцца і, чотка ўзяўшы вінтоўкі «к ноге», застываюць у чаканні ўрачыстага маршу.

На трыбунах — тысячы ўдарнікаў маскоўскіх заводаў і фабрык. На ганаровых месцах — перадавыя людзі Совецкага Саюза: 500 сваіх делегатаў прыслалі на ўрад крыло — адусюль грымяць авацыі і воклічы прывітанняў у гонар правадыра таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада.

На правым крыле маўзалея тт. Ягода, Гамарнік, Тухачэўскі, Егораў, Будзённы, Блюхер, Орлоў, С. С. Каменеў і іншыя асобы вышэйшага камандавання Чырвонай арміі. На ніжніх трыбунах тт. Сулімаў, Акулаў, Шкіратаў, Літвінаў, Межлаук, Бубноў, Хрушчоў, Шверник, Н. К. Крупская, М. І. Ульянава, Філатаў, Булганін

ідуць танкі-амфібіі, радыётанкі і танкі, якія прадстаўляюць сабой вялікія сухапутныя караблі. Атрады іх шматлікія. Песня матораў заглушае ўсе аркестры. З кожным імгненнем нарастае жалезны марш.

Роўна ў 12 гадзін дня на Красную плошчу ўступаюць калоны працоўных пролетарскай сталіцы.

Лес сцягаў і транспарантаў... Мора фарбаў... Шчаслівыя, радасныя твары, прыгожае святочнае адзенне. Радасныя воклічы ў го-

Гэтыя вялікія словы правадыра сотні разоў паўтараюцца на транспарантах, велізарных паветраных шарах, лёгкіх ажурных дзісках, чырвоных палотнішчах. І над гэтымі лозунгамі крочаць лепшыя людзі нашай краіны. У першых радах заводскіх калон — стаханаўцы, узначаліўшыя народны рух за высокую прадукцыйнасць працы.

Разам з пролетарыямі Масквы дэманструюць свае перамогі знатныя людзі калгасаў Маскоўскай вобласці. Наперадзе свае

Грандыёзны перамогі сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя перамогі і дасягненні бачыць і адчувае кожны працоўны нашай краіны. Гэтыя перамогі і дасягненні — рэзультат мудрага кіраўніцтва геніяльнейшага чалавека нашай эпохі вялікага **Сталіна**, рэзультат адзіна правільнай ленінскай палітыкі партыі большэвікоў, партыі **Леніна—Сталіна**. Вось чаму шматтысячныя дэманстрацыі ва ўсіх гарадах Совецкага Саюза, святкаванні ва ўсіх гарадах, раёнах і калгасах Совецкай Беларусі прайшлі пад знакам **бязмежнай адданасці і любві працоўных мас**

Растуць і мацнеюць нашы калгасы. Пад кіраўніцтвам партыі, уладаючы такой магутнай зброяй, як сталінскі статут, усё больш упэўнена ідуць калгаснікі да шчаслівага, багатага і культурнага жыцця, аб якім ніколі не мог марыць беларускі селянін. Зямля навекі замацавана за калгасамі. Паступова ўсё больш спіраецца процілегласць паміж горадам і вёскай. І найярчэйшым пацвярджэннем велізарнага палітычнага, гаспадарчага і культурнага росту калгаснага сялянства і бязмежнай адданасці калгаснікаў большэвіцкай партыі былі

кая партыя, вядзе найвялікшы геній чалавецтва — **Сталін**. Мы ўпэўнена ідзем да новых поспехаў і перамог, як-бы ні лютавалі вакол Совецкага Саюза фашысцкія грамілы—ланцужныя сабакі капіталізма.

Мы ўпэўнена глядзім у будучыню. Будучыня належыць рабочаму класу. Сацыялізм пераможа ва ўсім свеце, як перамог ужо на адной шостай зямнога шара.

Пад баявымі сцягамі Кастрычніка, пад сцягамі партыі **Леніна—Сталіна** ўперад, да новых перамог!

7 ЛІСТАПАДА У МАСКВЕ

МАСКВА, 9 лістапада. (БЕЛТА). З некалькіх бакоў падыходзяць да Краснай плошчы войскі. Маналітнымі батальёнамі ўступаюць яны на ўсыпаную пяском брусчатку, выраўнёваюцца і, чоткі ўзяўшы вінтоўкі «к ноге», застываюць у чаканні ўрачыстага маршу.

На трыбунах — тысячы ўдарнікаў маскоўскіх заводаў і фабрык. На ганаровых месцах — перадавыя людзі Совецкага Саюза: 500 сваіх дэлегатаў прыслалі на ўрачыстасці ў сталіцу пролетарыі горада Леніна, дэлегацыю знатных забойшчыкаў адправілі шахцёры Данбаса, лепшых майстроў сацыялістычнага ўраджаю паслалі сельскагаспадарчыя раёны Украіны, Маскоўская вобласці. На ўрачыстасцях прысутнічаюць славуты забойшчык Данбаса Алексей **Стаханаў**, яго таварыш Мірон **Дзюканаў**, вічугскія ткачыхі Марыя і Еўдакія **Вінаградавы**, лепшы ўдарнік аўтатрактарнай індустрыі **Бусыгін**.

Тут-жа прысутнічаюць прадстаўнікі зарубежнага пролетарыята — французская, іспанская, англійская, чэхаславацкая, бельгійская, галандская, швецкая, данская, паўднёваафрыканская рабочыя дэлегацыі.

З вежаў Крэмля за гэтыя дні зніклі атрыбуты старога — царскія арлы. Зараз на высокіх шпілях зяюць дарагімі алмазамі аметыстамі, горным хрусталем і тапазамі цудоўныя крэмлёўскія авёзды — выдатны твор ударнай працы.

Хутка 10. З Крэмля выходзяць таварышы **Сталін, Молатаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Рудзутак**. Яны ідуць да маўзалея і падымаюцца на яго левае крыло — адусюль грымяць авацыі і воклічы прывітанняў у гонар правадыра таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада.

На правым крыле маўзалея тт. Ягода, Гамарнік, Тухачаўскі, Егораў, Будзённы, Блюхер, Орлоў, С. С. Каменеў і іншыя асобы вышэйшага камандавання Чырвонай армії. На ніжніх трыбунах тт. Сулімаў, Акулаў, Шкіратаў, Літвінаў, Межлаук, Бубноў, Хрушчоў, Швернік, Н. К. Крупская, М. І. Ульянава, Філатаў, Булганін і інш.

У поўным складзе дыпламатычны корпус і ваенныя аташэ.

Доўгае і громагласнае «ўра», гарачыя апладысменты дзесяткаў тысяч людзей сустракаюць наркома абароны т. **К. Е. Варашылава**, які прымае рапарт камандуючага парадам т. Гарбачова. Нарком віншуе байцоў са святам XVIII гадавіны Вялікай пролетарскай рэволюцыі, і плошча адгукаецца магутнымі раскатамі «ўра».

Падняўшыся на трыбуну маўзалея пасля аб'езду войск, т. Варашылаў гаворыць прамову, якая транслюецца радыёстанцыямі па ўсяму Совецкаму Саюзу.

І калі т. Варашылаў заканчвае прамову, раздаюцца раскаты гарматнага салюта, бясконцае «ўра» і велічныя гукі «Інтэрнацыянала».

Кастрычніцкі салют адгрымеў. Войскі пачынаюць урачысты марш. Роўным строем крочыць начальніцкі састаў Чырвонай арміі, за ім слухачы акадэміі РСЧА, цьматлікія кадры камандзіраў, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна. Высока падняўшы чырвоны сцяг, ідзе наперадзе ваенна - паветранай акадэміі імя Жукоўскага герой Совецкага Саюза Нікалай Каманін, а ўслед — слухачы акадэміі — гордыя сокалы Краіны Совецкаў.

Ні на мінуту не спыняецца ход часцей. У строгіх чорных шынелях і асляпляюча белых пальчатках — слаўныя чырвонафлотцы, абаронцы морскіх рубяжоў Совецкага Саюза. Маналітнымі калонамі ідзе пролетарская дывізія. Байцы яе ў жалезных касках. Яны грозна трымаюць вінтоўкі наперавес.

Новыя часці войск паяўляюцца на плошчы. Конная артылерыя грамыхае гарматамі, паўзуць цяжкія гарматы, з аголенымі шаблямі скачуць эскадроны чырвоных кавалерыстаў. Секунда перапынку, і плаўна коцяцца атрады веласіпедыстаў у чорных, блакітных, сініх і чырвоных камбінезонах і шлёмах.

І толькі ад'язджаюць веласіпедысты, адкрывае свой марш грозная машынная тэхніка рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

Суровай калонай праходзяць бранявыя аўтамабілі, на грузавіках — матарызаваная пяхота, на грузавіках-жа — кулямётныя і артылерыйскія часці, гукаўлавіцелі і пражэктары. Віхрам урываюцца на плошчу і ў момант знікаюць быстраходныя танкі, услед зноў бронемашыны і цэлая ўсесакрушаючая армія танкаў. Ідуць танкі-амфібіі, радыётанкі і танкі, якія прадстаўляюць сабой вялікія сухапутныя караблі. Атрады іх шматлікія. Песня матораў заглушае ўсе аркестры. З кожным імгненнем нарастае жалезны марш.

Роўна ў 12 гадзін дня на Красную плошчу ўступаюць калоны прапоўных пролетарскай сталіцы.

Лес сцягаў і транспарантаў... Мора фарбаў... Шчаслівыя, радасныя твары, прыгожае святочнае адзенне. Радасныя воклічы ў гонар кіраўнікоў партыі і ўрада.

— Прывітанне вялікаму Сталіну!

— Дзякуй роднаму Сталіну за шчаслівае радаснае жыццё!

Галоўнае ў дэманстрацыі — паказ лепшых людзей нашай краіны, паказ у дзеянні выдатнага сталінскага лозунга «кадры вырашаюць усё».

«Тэхніка на чале з людзьмі, аўладаўшымі тэхнікай, можа і павінна даць цуды».

Гэтыя вялікія словы правадыра сотні разоў паўтараюцца на транспарантах, велізарных паветраных шарах, лёгкіх ажурных дзісках, чырвоных палотнішчах. І пад гэтымі лозунгамі крочаць лепшыя людзі нашай краіны. У першых радах заводскіх калон — стаханаўцы, узначаліўшыя народны рух за высокую прадукцыйнасць працы.

Разам з пролетарыямі Масквы дэманструюць свае перамогі і знатныя людзі калгасаў Маскоўскай вобласці. Наперадзе сваёй калоны яны нясуць вялікае палотнішча з простымі, але хвалюючымі словамі:

— Дзякуй таварышу Сталіну за калгасны статут заможнага жыцця.

Да позняга вечара цягнулася гэта выключная па сіле і магутнасці дэманстрацыя пролетарыяў, чырвонай сталіцы—сталіцы бацькаўшчыны працоўных усяго свету.

ПРАМОВА тав. К. Е. ВАРАШЫЛАВА

НА ПАРАДЗЕ Ў МАСКВЕ 7 ЛІСТАПАДА 1935 Г.

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі, таварышы рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы, таварышы работнікі навукі, тэхнікі і мастацтваў, таварышы дарагія госці—прадстаўнікі лепшых людзей нашай краіны і пролетарыяў капіталістычных краін!

Ад імя і па даручэнню Цэнтральнага Камітэта ўсесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў і ўрада Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік вітаю вас і віншую з вялікім святам усяго працоўнага чалавецтва—18-й гадавінай пролетарскай рэволюцыі!

У гэтыя дні сэрцы ўсіх прапоўных нашай сацыялістычнай радзімы б'юцца ў унісон вялікай радасцю. Мы ўсе горды і перапоўнены радасцю таму, што Саюз Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік — дзяржава сацыялізма—стаў яшчэ больш магутным, яшчэ больш моцным, яшчэ больш слаўным. Мы горды і радуемся таму, што нашы поспехі і дасягненні сапраўды велізарны. Магутны рост цяжкай прамысловасці—гэтага станавога хрыбта сацыялістычнай гаспадаркі, поспехі нашай лёгкай і харчовай прамысловасці, велізарны скачок наперад чыгуначнага транспарту, далейшы нязменны рост і іншых галін нашай народнай гаспадаркі і, нарэшце, бурны росквіт калгаснага ладу, які хутка і карэнным чынам пераўтварае усю нашу вёску, робіць з яе вялікі аплот будаўніцтва сацыялізма, перарабляе ў корані і нанава ўсю мільённую масу тружанікаў зямлі—як усяму гэтаму не радавацца, як у наша вялікае свята ўсё гэта не адзначыць?!

Мы ганарымся, таварышы, і тым, што побач з ростам матэрыяльных рэсурсаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва развівалася, мацнела, цвіла ўсімі кветкамі магутная сацыялістычная культура ва ўсіх яе напрамках і многагранных праяўленнях.

Мы радуемся таксама і таму, што разам з ростам матэрыяльных багаццяў вялікага Совецкага Саюза рос, перарабляўся, удасканальваўся, станавіўся іншым, лепшым, сапраўдным будаўніком сацыялізма чалавек: рабочы, калгаснік, работніца, калгасніца, вучоныя, тэхнікі, наша змена—комсамольцы і піонеры.

Наш вялікі Совецкі Саюз—дзяржава пролетарыята — нязменна, цяпер як і раней, стаіць на пазіцыях міру. Мы, як і раней, і цяпер заяўляем усяму свету, што будзем і ў далейшым стаяць на старых нязменных пазіцыях міру ва ўсім свеце. Але, як і раней, наша партыя і ўрад, наш вялікі **Сталін** пытанням абароны аддавалі і аддаюць многа ўвагі, энергіі і сіл. Як і раней, клопаты аб узброеных сілах нашай дзяржавы былі ў першым раду ўсіх клопатаў па будаўніцтву дзяржавы пролетарскай рэволюцыі. Наша рабоча-сялянская Чырвоная армія прабавала не адставаць ад бурнага пераможнага шэствія ўсёй краіны ў цэлым. І мне здаецца, што яна ў гэтым сяму-таму навучылася і дасягнула поспехаў.

Наша рабоча-сялянская Чырвоная армія, абараняючы мір ва ўсім свеце, гатова кожную мінуту рынуцца ў тое месца, дзе будуць парушаны свяшчэнныя граніцы нашай пролетарскай дзяржавы. Рабоча-сялянская Чырвоная армія адным магутным рыўком адкіне ўсякага ворага туды, адкуль ён прышоў, і будзе яго біць там, адкуль ён прышоў, адкуль узнамерыўся апаганіць нашу святую совецкую зямлю.

Няхай жыве далейшы рост і росквіт усёй нашай дзяржавы!

Няхай жывуць народы, якія насяляюць бязмежныя прасторы нашай совецкай зямлі!

Няхай жыве наша вялікая партыя **Леніна—Сталіна** — арганізатар, кіраўнік і рулявы ўсяго будаўніцтва!

Няхай жыве наш вялікі, слаўны друг, правадыр таварыш **Сталін**!

Ура!

СТАХАНАЎЦЫ НА ПРЫЁМЕ Ў ТАВАРЫША ГІКАЛО

Учора, 9 лістапада, сакратар ЦК КП(б)Б тав. **ГІКАЛО** прыняў групу стаханаўцаў прадпрыемстваў БССР, Ленінграда і Кіева, якія прымалі ўдзел у Кастрычніцкіх урачыстасцях у Менску. На прыёме прысутнічалі таксама тт. **Кавальчук, Готфрыд, Конін, Гершон, Аўгустайціс, Балцін, Геаргадзе, Гераўкер,** члены прэзідыума ЦСПСБ і рад работнікаў гаспадарчых і профсаюзных арганізацый і друку.

Ад імя ленінградскай дэлегацыі **тав. Берлін** вітаў таварыша **Гікало** з велізарнымі перамогамі, якія БССР пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б атрымала.

З прывітаннем ленінградскіх пролетарыяў і прысутных стаханаўцаў БССР выступіў **Н. Ф. Гікало.**

Аб сваіх вытворчых поспехах, аб новых метадах работы, якія далі бліскучыя рэзультаты, расказалі стаханаўцы: **Семенідава** (віцебская фабрыка «Сняг індустрыялізацыі»), **Федарэнка** (Рэчыцкі завод «Окцябр»), **Байкачоў** (машыніст Жлобінскага вузла), **Фейгін** (віцебская фабрыка «Дзвіна»), **Скабло Г.** (менская фабрыка імя Кагановіча). Таварыш Гікало задаваў выступаўшым рад пытанняў, цікавячыся метадамі іх работы, заработкам, культурна-бытавымі ўмовамі, дапамогай фабрычна-заводскіх арганізацый і хто і што перашкаджае ў іх рабоце.

Дырэктар Белметалаб'яднання тав. **Левін**, які нядаўна вярнуўся са службовай камандыроўкі з Германіі, падзяліўся ўражаннямі аб рабоце прамысловасці і жыцця рабочых ў фашысцкай Германіі.

Тав. Дабравольская (віцебская фабрыка «КІМ») зачытала прывітальнае пісьмо тав. Гікало, прынятае ўсімі дэлегацыямі стаханаўцаў, якія прымалі ўдзел на прыёме.

У заключэнне выступіў з вялікай прамовай, спатканы бурнымі апладысментамі, таварыш **ГІКАЛО.**

Цёпла развітаўшыся, стаханаўцы падзякавалі кіраўніка большэвікоў Беларусі за прыемную гутарку і запэўнілі яго, што не спыняцца на дасягнутых поспехах, што будуць змагацца за новыя перамогі.

Падрабязная справаздача аб прыёме будзе ў наступным нумары газеты.

***

Учора-ж тав. Гікало прыняў удзельнікаў пераходу у супроцьгазах Віцебск—Менск і Менск—Барысаў—Менск.

XVIII ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ Ў МАСКВЕ.



Парад на Краснай плошчы. На здымку злева: т. **ВАРАШЫЛАЎ** на кані, справа: прахаджэнне танкаў на Краснай плошчы.

XVIII гадавіна Кастрычніцкай рэволюцыі ў Менску

На трыбуне ля Дома ўрада. Справа налева: сакратар ЦК КП(б)Б т. ГІКАЛО, сакратар ЦК КП(б)Б т. ВАЛКОВІЧ, старшыня Соўнаркома БССР т. ГАЛАДЗЕД, старшыня ЦВК БССР т. ЧАРВЯКОЎ, камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі т. УБАРЭВІЧ.
Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

НАРОДНАЕ СВЯТА

Мяккая шапка туману накрыла горад. Не гледзячы на ранні час, вуліцы былі ў руху і тратуары запоўнены людзьмі. Дзесьці далёка былі чутны гукі аркестраў і стройныя галасы.

Пляц Леніна пусты. Веліччу выступаюць з малочнай імглы Дом урада і будынкі універсітэцкага гарадка. Нерухомы постаці лінейных. Цмяна пабліскваюць штыхі і сталёвыя шлемы.

Пачынаюць яснець контуры будынкаў. Туман паступова рассейваецца. На ўсходзе робіцца святлей. Час блізіцца к поўдню. Трыбуны каля помніка Леніна запаўняюцца. Тут госці з буйнейшых гарадоў Саюза, стаханаўцы фабрык і заводаў БССР, адважныя ўдзельнікі пераходу Менск—Барысаў — Менск і Віцебск — Менск, ударнікі вучобы, вучні школ Менска.

На франтоне Дома ўрада партрэт таварыша **Сталіна** ва ўвесь рост. Лёгка калышуцца сцягі, якія палыхаюцца ветрам. Насупраць, на доме металістаў, вялікі партрэт тт. **Сталіна і Варашылава,** якія нібыта ўважліва глядзяць на незапоўнены яшчэ пляц.

Аб'езд часцей закончан. Тав. Убарэвіч падымаецца на трыбуну і зварачаецца з прамовай да байцоў, камандзіраў, палітработнікаў, рабочых, калгаснікаў, усіх працоўных Совецкай Беларусі. Ён вітае іх са святам 18-й гадавіны Вялікай пролетарскай рэволюцыі ў СССР.

— Няхай жыве доблесная Чырвоная армія!—заканчвае сваю прамову тав. Убарэвіч.

— Няхай жыве правадыр сусветнага пролетарыята наш любімы, дарагі **Сталін!**

Незмаўкаемае «ўра» нясецца ў адказ.

Мінута маўчання. Пляц замірае.

— Да ўрачыстага маршу, — раздаецца каманда.

Пачынаецца праходжанне часцей. З вінтоўкамі «на руку», чотка адбіваючы крок, ідзе пяхота. Уперадзе Аб'яднаная Беларуская вайсковая школа імя М. І. Калініна, якая сёння святкуе чарговы выпуск сваіх выхаванцаў. Чырвоныя лейтэнанты праходзяць каля трыбуны, паказваючы клас страявога майстэрства і культуры навучання.

— Няхай жыве любімы **Сталін!**

ства ў Кастрычніку 1917 года і за прайшоўшыя 18 год.

Праносяцца слаўныя будзёнаўскія тачанкі, з якіх храбрыя кулямётчыкі могуць бязлітасна паліваць ворага вогненным дажджом. За тачанкамі лёгкай рысцю імчыцца кавалерыя. Калышуцца значкі падраздзяленняў, коннікі ледзь стрымліваюць коней.

На пляц уступаюць батальёны ўзброенага менскага пролетарыята. Мощным роўным крокам праходзяць шарэнгі па рознаму адзетых людзей з вінтоўкамі на рамені. Сёння яны токары, слесары, краўцы, шаўцы, студэнты. Але калі вораг папрабуе працягнуць сваю брудную лапу да совецкага дабра, яны зараз-жа зменяць варштаты і кнігу на зброю, каб самаадданa абараняць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну.

Ход раённых калон адкрываюць равеснікі Кастрычніка. Ім 18 год. Яны ніколі не бачылі сапраўднага жандара і паліцэйскага. Адначасова з сёнешняй гадавінай краіны спаўняецца іх уласнае поўналецце. Яны самыя шчасліўцы ў Совецкай краіне.

Самай цікавай па свайму афармленню была безумоўна калона Кагановіцкага раёна.

У пярэдніх радах дэманстрантаў фабрыкі імя Кагановіча ідуць стаханаўцы — лепшыя людзі прадпрыемства. Весялосцю іскрыцца калона фабрыкі «Окцябр». Танцоры ў беларускіх нацыянальных касцюмах праходзяць міма трыбуны, выконваючы «ляволіху». Граюць гармонікі. Гучныя апладысменты раздаюцца на трыбуне.

Каля двух гадзін прадаўжалася праходжанне часцей Чырвонай армії і амаль столькі-ж працягваецца дэманстрацыя. Але не ўсе раёны яшчэ прайшлі праз пляц. Ідзе Варашылаўскі раён. Зноў лес сцягаў, лозунгі і прывітанні любімаму **Сталіну.** Перад трыбунай танцоры трамвайнага парку. Радасць і смех у калонах.

Прайшлі дэманстранты, на пляцы з'явіліся аўтамашыны па дзве ў рад. На іх едуць калгаснікі-ўдарнікі Менскага раёна.

Калгаснікі на аўтамашынах! Прышоў час і ажыццявіліся сказаныя калісь Леніным словы. Мужык сеў не толькі на трактар, соцыялізма і з гордасцю прыслухоўваюцца да яго прамовы тысячы людзей, якія сядзяць у залі, яе слухаюць па радыё па вуліцах і плошчах.

Пасля выступлення М. І. Калініна сакратар Маскоўскага гарадскога камітэта ВКП(б) т. Кульков пад гром авацый зачытвае прывітанне таварышу Сталіну. Прымаецца таксама прапанова даручыць прэзідыуму паслаць прывітанні ўраду СССР таварышам Молатаву і Калініну, рабоча-сялянскай Чырвонай армії — таварышу Варашылаву і Выканкому Комуністычнага Інтэрнацыянала.

З велізарным уздымам усе прысутныя пяюць «Інтэрнацыянал».

Затым, у прысутнасці членаў Палітбюро, на чале з таварышам **Сталіным,** адбыўся паказ мастацкай самадзейнасці рабочых маскоўскіх заводаў і фабрык. На сцэне Вялікага Дзяржаўнага Акадэмічнага тэатра СССР выступілі калектывы прадпрыемстваў і выканаўцы-адзіночкі, якія выявілі выключнае майстэрства і нагадна паказалі, што рабочы клас і на фронце мастацтва авалодвае вялікімі вышынямі. З захапленнем віталі глядачы піянераў, якія прадэманстравалі багацце талантаў, растучых сярод совецкай дзетвары.

ДВА МАРШЫ

Калоны ішлі бесперапынным патокам. Ішлі — гэта будзе не аусім дакладна. Ісці можна па-рознаму. Калоны-ж ішлі так, што ў кожным кроку, у кожным узмаху рукі, у кожным поглядзе адчуваецца асаблівая, маладая, непераможная сіла.

Праходзіла пяхота, кавалерыя, артылерыя... многа тэхнікі, многа машын.

Гудзела маставая, дрыжэлі шыбы, цвіла ў кветках і снягах Совецкая вуліца.

І ўспомнілася... Тады таксама дрыжэлі шыбы.

Па пяперашняй Совецкай вуліцы ў тым-жа напрамку, як ідуць калоны не ішлі, а беглі белапольскія войскі. Яны беглі, бо дорага каштавала кожная хвіліна, бо адтуль, да гэтага-ж маста, рушылася Чырвоная армія, армія, якая так пераможна праходзіць зараз каля трыбуны.

Белапольскія войскі ўцякалі, пакідаючы, як след за сабою, адбітак зарава пажараў у дрыжачых шыбах, развалiны і трупы.

З усхода праз Камароўку на Совецкую вуліцу выходзілі чырвоныя войскі. Яны былі стомлены, але не адчувалі стомленасці. Яны былі не накормлены, але не адчувалі голаду, яны былі разуты, але не ведалі холаду.

Яны ішлі па гораду і ўслед ім адкрываліся акяніцы, іх выходзілі вітаць працоўныя Менска, якія ведалі, што яны — іх адзіныя абаронцы.

І тады Чырвоная армія пераможным маршам вызваліцеля прайшла па Совецкай. На плячах былі вінтоўкі розных узораў, ногі былі ў пацямнеўшых і парваных абмотках. Але на бледных, змучаных вайной тварах іскрылася ўсмешка радасці за перамогу і ўпэўненасці ў сваёй праўдзе.

Яны ішлі з усхода на захад, несучы з сабой на захад цяпло і святло сонца, радасць жыцця, жыцця новага, нябачанага да гэтага нікім і ніколі.

Гэта ўсё ўспамінаецца і нельга не ўспомніць, калі глядзіш на гэтыя роўныя шарэнгі маладых і здаровых людзей, цвёрдым крокам ідучых па сваёй аднаўленай зямлі, сярод новых пабудоў і новых вуліц, якія акружаны ўсё той-жа любоўю народу.

Са сцяны, насупроць трыбуны, як жывыя глядзяць на гэтыя калоны з партрэта тт. Сталін і Варашылаў. Яны нахіліліся нібы для таго, каб лепш угледзецца ў гэтыя рады, праверыць ці ўсім забяспечаны гэтыя байцы адзінай у свеце армії працоўнага народу.

Іх любіць народ, іх любіць партыя, іх любіць вялікі Сталін. І ў гэтым пераможным маршы аллюстроўвалася сіла гэтай любві. Яны забяспечаны ўсім. Яны добра адзеты і сыты. Яны добра ўзброены і падрыхтаваны, у іх добрыя коні, але самае галоў-

НА УРАЧЫСТЫМ ПЛЕНУМЕ МАСКОУСКАГА СОВЕТА

НА ПЛЕНУМЕ ПРЫСУТНІЧАЎ ТАВАРЫШ СТАЛІН

МАСКВА, 9 лістапада. (БЕЛТА). 6 лістапада ў Вялікім тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне Маскоўскага Совета сумесна з ударнікамі маскоўскіх прадпрыемстваў, з прадстаўнікамі Чырвонай армії, навукі, мастацтва.

Сцягі з гербамі саюзных рэспублік прыгожа афармляюць трыбуну. Углыбіні яе, сярод ізумруднай масы зелені — вялікі бюст Леніна, над ім партрэт таварыша Сталіна.

Тэатр перапоўнен. На трыбуне— таварыш **Сталін** і таварышы **Молатаў, Каганові́ч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Рудзутак, Сулімаў, Акулаў, Хрушчоў, Швернік, Філатаў, Булганін** і інш.

Адбываецца незабываемая хвалюючая сустрэча. Грымяць доўганезмаўкаючыя поўныя захаплення авацыі «ўра Сталіну». Апладысменты змаўкаюць на некалькі імгненняў і з новай сілай аднаўляюцца, калі старшыня Маскоўскага Совета т. Булганін, пачынаючы ўступную прамову, першыя словы прысвячае таварышу Сталіну.

Слова для даклада прадастаўляецца старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР т. **М. І. Калініну.** Спатканы гарачымі і доўганезмаўкаючымі апладысментамі ўсесаюзны староста гаворыць аб пераможным шэствіі

КРАІНА СОВЕТАЎ У ДНІ ВЯЛІКАЙ ГАДАВІНЫ

МАСКВА, 9 лістапада. (БЕЛТА). Уся краіна з найвялікшым уздымам святкавала 18-ю гадавіну Вялікай пролетарскай рэволюцыі. Усюды адбыліся ўрачыстыя пасяджэнні советаў і шматлікія дэманстрацыі працоўных, якія выйшлі на вуліцы для таго, каб паказаць **сваю бязмежную любоў і адданасць справе вялікай партыі Леніна—Сталіна.**

Магутная дэманстрацыя адбылася ў **Ленінградзе.** Велізарная плошча Урыцкага і прылягаючыя да яе вуліцы былі заняты войскамі. На Неве супроць Зімняга палаца выстраіліся караблі балтыцкага флота. На трыбуне тт. Жданаў, Чудаў, Струппе і інш.

Міма трыбун праходзіць пяхота, атрады чырвоных партызан, чырвонагвардзейцаў. Ідзе матарызаваная артылерыя. Велізарныя гусенічныя цягачы вязуць агромныя дальнабойныя гарматы. Імкліва праносяцца на аўтамашынах зенітныя гарматы, гукаўлавіцелі, рухлівыя гарматы на аўтамабілях, перасоўныя радыёстанцыі, пантоны, бранявыя аўтамашыны. Затым ідуць машыны з дэсантам парашутыстаў, а следам за імі адкрываецца бліскучы ход танкаў.

Па сканчэнні параду супэльны людскі паток заліў плошчу. Калоны пролетарыяў горада Леніна звыш трох гадзін ішлі міма трыбун.

На кастрычніцкія ўрачыстасці ў **Кіеве** з'ехаліся не толькі знатныя людзі Совецкай Украіны, але і дэлегацыі Узбекістана, Совецкай Беларусі, Азербайджана, Масквы, Ленінграда, Баку і інш. гарадоў. На трыбуне тт. Касіор, Постышаў, Петроўскі, Любчэнка, Папоў, Затонскі і іншыя кіраўнікі партыі большэвікоў і ўрада Украіны.

Па сканчэнні параду вайсковых часцей, у якім прымалі ўдзел пяхота, кавалерыя, артылерыя, бронявікі, танкі, пачалася магутная дэманстрацыя. У гэты дзень міма трыбун прайшлі сотні тысяч кіеўлян.

Магутныя дэманстрацыі адбыліся таксама ў Сталіно, у Запарожжы, Харкаве, Одэсе і іншых гарадах Украіны.

лей. Час блізіцца к поўдню. Трыбуны каля помніка Леніна запаўняюцца. Тут госці з буйнейшых гарадоў Саюза, стаханаўцы фабрык і заводаў БССР, адважныя ўдзельнікі пераходу Менск—Барысаў — Менск і Віцебск — Менск, ударнікі вучобы, вучні школ Менска.

На франтоне Дома ўрада партрэт таварыша **Сталіна** ва ўвесь рост. Лёгка калышуцца сцягі, якія палыхаюцца ветрам. Насупраць, на доме металістаў, вялікі партрэт тт. **Сталіна і Варашылава**, якія нібыта ўважліва глядзяць на незаапўнены яшчэ пляц.

12 гадзін. На ўрадавую трыбуну падымаюцца тт. **Гікало, Валковіч, Галадзед, Чарвякоў, Леплеўскі, Рыскін, Саакян, Смірноў, Бенек, Картукоў, Кавальчук, Любовіч, Рубінштэйн, Конік, Готфрыд** і іншыя члены ЦК КП(б)Б і ўрада.

Вярхом на кані выязджае камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі т. **Убарэвіч**. Ён прымае рапарт камандуючага парадам, аб'яжджае і вітаецца з часцямі, якія выстраены па Совецкай вуліцы. Грамавое чырвонаармейскае «ўра» раздаецца ў адказ на прывітанне тав. Убарэвіча. Грыміць «Інтэрнацыянал».

Незмаўкаемае «ўра» нясецца ў адказ.

Мінута маўчання. Пляц замірае.

— Да ўрачыстага маршу, — раздаецца каманда.

Пачынаецца праходжанне часцей. З вінтоўкамі «на руку», чотка адбіваючы крок, ідзе пяхота. Уперадзе Аб'яднаная Беларуская вайсковая школа імя М. І. Калініна, якая сёння святкуе чарговы выпуск сваіх выхаванцаў. Чырвоныя лейтэнанты праходзяць каля трыбуны, паказваючы клас страявога майстэрства і культуры навучання.

— Няхай жыве любімы **Сталін!**

— Няхай жыве рабоча-сялянская Чырвоная армія і яе жалезны нарком **Клім Варашылаў!**

У адказ на гэта нясецца магутнае чырвонаармейскае «ўра».

Пяхота прайшла. Пляц напаўняецца грукатам. Рыссю праносіцца артылерыя. Гаўбіцы, супрацьтанкавыя гарматы — усё гэта створана для Чырвонай арміі нашай социялістычнай індустрыяй. Яна ўзброіла ўсім гэтым армію для лепшай абароны краіны Совецтаў, усіх тых завяванняў, якіх дабіліся паўстаўшы пролетарыят і прапоўнае сялянстваў.

Ён і ёсць цэнтр, сэрца ўсяго таго, што разыходзіцца праменнямі ад Масквы па ўсяму свету.

У совецкай краіне яго аблюстраванне — бюст, партрэт, фото— усюды, як і аблюстраванне Леніна, побач з аблюстраваннем Леніна. Няма таго кутка на заводзе, у казарме, ва ўстанове, няма той вітрыны, дзе на чырвоным фоне, між маляўнічай дынтрамай социялістычнай статыстыкі і знакам сярпа і молата, мы не ўбачылі-б яго твару. Нідаўна на ўсіх сценах Расіі і іншых совецкіх рэспублік быў расклеены плакат з велізарнымі, находзячымі адзін на аднаго профілямі двух памёршых і аднаго жывога: Маркс, Ленін, Сталін. Не многа ёсць такіх жылых пакояў у рабочай, ці ў інтэлігенцкай сям'і, дзе не было-б партрэта Сталіна.

Вось яно — аблічча народу, які насяляе шостую частку свету, таго новага народу, які вы любіце або ненавідзіце.

***

Праз некалькі гадзін — снеданне. У Расіі гадзіна яго не адзначаецца вялікай пэўпасцю: у велізарнай большасці «адказных» размеркаванне дня залежыць ад работы. На гэты раз хай гэта будзе, калі хочаце, хоць у 2 гадзіны дня.

Крэмль — гэта крэпасць яркіх колераў, якая ўздымаецца ў самым цэнтры Масквы. За сцяной з варварскімі вежамі, расфарбаванымі зялёным і чырвоным, знаходзіцца цэлы горад старажытных златагаловых цэркваў і старадаўніх палацаў (там ёсць нават вялікі новы палац, пабудаваны ў XIX ст. адным з багатых памешчыкаў раманаўскай дынастыі і падобны на гатэль Карлтон). Тут, у Крэмлі, які нагадвае выстаўку цэркваў і палацаў, у падножжа аднаго з гэтых палацаў, стаіць маленькі трохпавярховы домік. Домік гэты (вы не заўважылі-б яго, калі-б вам не паказалі) быў раней службовым памяшканнем пры палацы — у ім жыў які-небудзь царскі служка.

Падымаемся па ўсходах. На вокнах белыя палатняныя фіранкі. Гэта тры акны кватэры Сталіна. У маленькай пярэдняй кідаецца ў вочы доўгі салдацкі шынель, над ім вісіць шалка. Тры пакоі і сталовая. Абстаўлены проста — як у добрай, але скромнай гасцініцы. Сталовая мае авальную форму; сюды падаецца абед—з крэмлёўскай кухні ці хатні, прыгатаваны кухаркай. У капіталістычнай краіне сярэдні служачы не задаволіўся-б ні такой кватэрай, ні такім меню. Тут-жа гуляе маленькі хлопчык. Старэйшы сын Яша спіць у сталовай,—яму спелюць на канапе; малодшы—у маленькім пакойчыку, накшталт нішы.

Пакончыўшы з ядой, чалавек курыць люльку ў крэсле ля акна. Адзеты ён заўсёды аднолькава. Вайсковая форма?—гэта было-б сказана занадта моцна. Хутчэй, памёк на форму—нешта такое, што яшчэ прасцей, чым адзенне радавога салдата: наглуха зашпіленая куртка і шаравары зашчытнага колеру, боты. Думаеш, успамінаеш... Не, вы ніколі не бачылі яго адзетым іначай, толькі ўлетку ён ходзіць у белым палатне.

Ёсць у яго штосьці такое ў поглядзе, у рысах твару, што ён увесь час здаецца з усмешкай. Або, дакладней, заўсёды здаецца, нібы ён зараз засмяецца. Такім-жа быў калісьці і той, другі. Не то, каб погляд быў крыху насмешлівы, —але вочы заўсёды прыжмураны. Не то, каб львіная складка твару (хоць ёсць часткова і гэта),—але выраз тонкай сялянскай лукавасці. На справе ён вельмі часта ўсміхаецца і смяецца ад чыстага сэрца. Гаворыць ён мала — ён, які ўмее тры гадзіны засаб гутарыць з вамі па выпадкова заданаму пытанню, умее так асвятліць любую праблему, што ў ёй не асталецца ні адной няяснай грані. Ён смяецца і нават хахоча куды ахвотней, чым гаворыць.

Вось ён — найвялікшы і значнейшы з нашых сучаснікаў. Ён вядзе за сабою 170 мільёнаў чалавек на 21 мільёне квадратных кілометраў. Ён сутыкаецца ў рабоце з мноствам людзей. І ўсе гэтыя людзі любяць яго, вераць яму, адчуваюць патрэбу ў ім, згуртоўваюцца вакол яго, падтрымліваючы і высоўваючы яго наперад. Ва ўвесь свой рост ён узвышаецца над Еўропай і над Азіяй, над мінулым і над будучым. Гэта — самы выдатны і ў той-жа час амаль самы назведаны чалавек у свеце.

***

Біяграфія Сталіна, — гаворыць Калінін, — «з'яўляецца вельмі важнай часцінай рабочага рэволюцыйнага руху ў Расіі».

Неадлучнай яго часткай! І як у Совецкім Саюзе, так і тут, — усякі, хто разумее справу, скажа вам тое-ж самае, тымі-ж словамі.

Грандыёзная задача — стварыць воблік чалавека, так непарыўна злітага з работай совецтвага значэння, вобраз палітычнага байца, скрозь якога вілны светы і эпохі. Ідучы за ім па шляхах яго жыцця, мы ўступаем на глебу гісторыі, мы вандруем па няходжаных дарогах, мы сутыкаемся з яшчэ неапублікаванымі раздзеламі біблії чалавецтва. Дакументы спякаюцца, нагромаджаюцца з усіх бакоў. Іх надта многа; і надта многае адкрываецца перад намі ў гэтых абноўленых гарызонтах. Прыходзіцца паступова расчышчаць просекі ў гэтай, яшчэ гарачай, яшчэ ўсхваляванай і жывой энцыклапедыі.

І тут мы трапляем у самае сэрца найвялікшага пытання не толькі нашага часу, але і ўсіх наогул часоў: якое-ж будучае роду чалавечага, так змучанага гісторыяй, якая тая мера добрабыту і земнай справядлівасці, на якую ён можа разлічваць? На што ў апошнім, вялікім выніку могуць спадзявацца два мільярды людзей? Гэтае пытанне ўзнікла з самых глыбінь чалавецтва; яно ўзнята праяспёна і пастаўлена ў парадак дня некалькімі сучаснымі вынаходцамі, якія жадаюць змяніць увесь свет справядлівым землетрасеннем; і чалавек, які стаіць зараз перад нашым узрокам, з'яўляецца іх прадстаўніком.

(«Правда»).

НОВЫ СВЕТ, ЯКІ ВІДЗЕН СКРОЗЬ ЧАЛАВЕКА

АНРЫ БАРБЮС

Урывак з кнігі „Сталін"

Красная плошча — цэнтр Масквы і велізарнай еўрапейскай і азіяцкай Расіі. Цэнтр Краснай плошчы — маўзалей. На верхавіне маўзалея, у якім спіць нібы жывы Ленін, стаяць побач пяць-шэсць чалавек. За некалькі крокаў яны ўсе здаюцца амаль аднолькавымі.

А кругом выходзіцца і разыходзіцца сіметрычнае кіпенне мас. Здаецца, нібы яно выходзіць з-пад зямлі і туды-ж, пад зямлю, адыходзіць. Узноўж і ўпыр плошчы ад краю да краю калейдаскапічна разгортваецца працэсія, — бясконцы ход, палыхаючы чырвоным палатном і шочкам, абцяжаным літарамі, словамі: матэрыя крычыць. Або гэта — велізарнае, спартыўнае свята: імкліва рушачыся наперад, яно разгортваецца, нібы парк. Або, нарэшце, — рух самай магутнай арміі ў свеце, разбіты на чатырохкутнікі чырвонаармейскі народ.

Перад намі ўсплывае то той, то другі кавалачак святочнасці, пабліскванне рухаючыхся шчаціннай штыхоў, або шарэнга юнакоў і дзяўчын, або проста ланцут гордых, шчаслівых, усмешлівых і светлых твараў.

Гэты шматгадзінны мыслячы прыбой, гэтае захапленне, якое вырываецца з натоўпаў, кіпіць вірам воклічаў і гоману. У гэтага віру ёсць цэнтр. Гэтыя воклічы набываюць форму чалавечага імя: «Сталін!», «Няхай жыве таварыш Сталін!». Адзін з стаячых на маўзалеі Леніна падносіць руку да казырка ці прывітальна падымае яе, сагнуўшы ў локці, раскрыўшы далонь. Чалавек гэты апранут у доўгі вайсковы шынель, што між іншым не выдзяляе яго сярод іншых, якія стаяць побач.

Неадлучнай яго часткай! І як у Совецкім Саюзе, так і тут, — усякі, хто разумее справу, скажа вам тое-ж самае, тымі-ж словамі.

Грандыёзная задача — стварыць воблік чалавека, так непарыўна злітага з работай совецтвага значэння, вобраз палітычнага байца, скрозь якога вілны светы і эпохі. Ідучы за ім па шляхах яго жыцця, мы ўступаем на глебу гісторыі, мы вандруем па няходжаных дарогах, мы сутыкаемся з яшчэ неапублікаванымі раздзеламі біблії чалавецтва. Дакументы спякаюцца, нагромаджаюцца з усіх бакоў. Іх надта многа; і надта многае адкрываецца перад намі ў гэтых абноўленых гарызонтах. Прыходзіцца паступова расчышчаць просекі ў гэтай, яшчэ гарачай, яшчэ ўсхваляванай і жывой энцыклапедыі.

І тут мы трапляем у самае сэрца найвялікшага пытання не толькі нашага часу, але і ўсіх наогул часоў: якое-ж будучае роду чалавечага, так змучанага гісторыяй, якая тая мера добрабыту і земнай справядлівасці, на якую ён можа разлічваць? На што ў апошнім, вялікім выніку могуць спадзявацца два мільярды людзей? Гэтае пытанне ўзнікла з самых глыбінь чалавецтва; яно ўзнята праяспёна і пастаўлена ў парадак дня некалькімі сучаснымі вынаходцамі, якія жадаюць змяніць увесь свет справядлівым землетрасеннем; і чалавек, які стаіць зараз перад нашым узрокам, з'яўляецца іх прадстаўніком.

(«Правда»).

Са сцяны, насупроць трыбуны, як жывыя глядзяць на гэтыя калоны з партрэта тт. Сталін і Варашылаў. Яны нахіліліся нібы для таго, каб лепш угледзецца ў гэтыя рады, праверыць ці ўсім забяспечаны гэтыя байцы адзінай у свеце арміі прапоўнага народу.

Іх любіць народ, іх любіць партыя, іх любіць вялікі Сталін. І ў гэтым пераможным маршы аблюстроўвалася сіла гэтай любві. Яны забяспечаны ўсім. Яны добра адзеты і сыты. Яны добра ўзброены і падрыхтаваны, у іх добрыя коні, але самае галоўнае — яны маюць тое, чаго няма ні ў адной арміі ў свеце — яны маюць вялікую, непераможную ідэю, вялікую веру ў сваю справу, яснасць сваёй мэты і задач, мудрага правадыра — партыю большэвікоў на чале з вялікім **Сталіным** і жалезнага кіраўніка — першага маршала Совецкага Саюза — **Варашылава**.

...Чоткія крокі па маставой, не дрыжаць вінтоўкі ў пвёрдых руках, высока падняты галавы, радасныя і вясёлыя погляды

Л. ГЛЕЗЕР.

УРАЧЫСТЫ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

Ярка асветлена зала з'ездаў Дома ўрада. У глыбіні сцэны велізарны партрэт Леніна і Сталіна. Зала і амфітэатр перапоўнены членамі гарадскога совета, знатнымі людзьмі сталіцы БССР, стаханаўцамі фабрык і заводаў, прадстаўнікамі Чырвонай арміі.

Старшыня Менскага гарадскога совета т. **Жуковіч**, адкрываючы ўрачысты пленум, прапануе ўшанаваць памяць лепшых сыноў рабочага класа, загінуўшых у баях за ўладу Советаў, за комунізм.

Уся зала ўстае. Аркестр грае жалобны марш.

За сталом прэзідыума з'яўляюцца тт. **Гікало, Валковіч, Галадзед, Чарвякоў, Убарэвіч, Саакян, Рыскін, Леплеўскі, Кавальчук, Горын, Аўгустайціс, Хадасевіч.** Яны сустракаюцца бурнымі апладысментамі.

У прэзідыуме займаюць месцы прыбыўшыя на ўрачыстасці ў Менск дэлегацыі пролетарыяў Ленінграда, УССР, Смаленска і прадстаўнікі выканкома МОПР'а негр Петэрсон і немец Бенціх.

У ганаровы прэзідыум выбіраюцца таварыш **Сталін**, тт. **Кагановіч, Молатаў, Варашылаў, Калінін, Орджанікідзе, Андрэеў, Чубар, Мікоян, Касіор, Жданаў, Постышэў, Петроўскі, Рудзутак, Эйхе, Гікало, Галадзед, Дзімітраў і Тэльман.**

Калі называецца імя Сталіна, усе ўстаюць і гром апладысментаў сатрасае сцены залы. Доўга працягваюцца бурныя авацыі ў гонар любімага правадыра ўсіх прапоўных.

— Ура вялікаму Сталіну! — нясецца з залы.

У гэтых бурных авацыях, у радасным «ура» адлюстроўваецца вялікая любоў і адданасць прапоўных БССР сваёй большэвіцкай партыі, ураду, Сталіну.

Бурнымі апладысментамі сустракаюцца імёны членаў Палітбюро, бліжэйшых саратнікаў вялікага Сталіна.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР т. **Галадзед**, спатканы гучнымі апладысментамі, выступіў з дакладам «18 год Вялікай пролетарскай рэволюцыі ў СССР».

Магутным росквітам заблішчэла наша радзіма. Лічбамі і фактамі т. Галадзед прадэманстраваў велізарныя поспехі Совецкага Саюза на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва. У нагу з усім Совецкім Саюзам ідзе наша ордэнаносная БССР — магутны форпост СССР на рубяжы з капіталістычным Захадам.

Даклад т. Галадзеда, поўны глыбокага зместу, быў выслуханы з вялікай увагай.

Слова для прывітання атрымлівае прадстаўнік дэлегацыі ленінградскіх пролетарыяў, рабочы завода імя Кірава тав. Перын. Яго прамова была пакрыта воклічамі «Большэвіцкае прывітанне героічным пролетарыям слаўнага горада Леніна».

Тав. Гарадзецкі вітае пленум ад імя гарадскога совета сталіцы Украінскай ССР. Ад Заходняй вобласці выступіў т. Вальковіч.

Гарачыя прамовы сказалі прадстаўнікі выканкома МОПР тт. Петэрсон і Бенціх.

Загучэлі фанфары. Стройнымі радамі ў залу ўвайшла дэлегацыя Менскага гарнізона. Гарачымі апладысментамі сустрэлі дэлегаты совета чырвоных байцоў. Ад імя камандзіраў і чырвонармейцаў гарнізона пленум вітаў тав. Багамолаў.

Выступілі ад стаханаўцаў завода імя Кірава т. Васілеўскі і ад равеснікаў Кастрычніка — т. Маляўка.

У дні святкавання гадавіны Кастрычніка ў Менску фінішавалі ўдзельнікі трох слаўных баявых пераходаў у супрацьгазах і супрацьіпрытных касцюмах. Пераход Менск—Барысаў—Менск, арганізаваны рабочымі фабрыкі «Сцябор», працягваўся 28 гадзін 11 мінуту замест намечаных 35 гадзін. Бліскуча завершан пераход Віцебск—Менск. Ішлі даяўчаты-ўдарніцы фабрыкі «Сняг індустрыялізацыі».

Тав. Слесарава, рапартуючы ад раўнікам партыі і ўрада, пленуму гарадскога совета, гаворыць, што фабрыка «Сняг індустрыялізацыі» стала сапраўднай крэпасцю абароны. На фабрыцы налічваецца 1.226 значкістаў ГПА, 400 значкістаў «Гатоў да санітарнай абароны», 400 варашылаўскіх стралкоў, 21 планерыст, 8 парашутыстаў.

Тав. Тапакоў расказвае аб тым, што група байцоў Н-скай часці зрабіла паспяховы пераход у супрацьгазах і супрацьіпрытных касцюмах. 212 кілометраў пройдзены за 34,5 халавых гадзін. Выдача, пастаўленая перад байцамі камандваннем палка, выканана на «выдатна».

Пленум сустрэў удзельнікаў пераходаў шумнымі апладысментамі.

Пленум гарадскога совета пасылае прывітальныя тэлеграмы таварышу **Сталіну**, ураду СССР — тт. **Калініну і Молатаву**, наркому абароны т. **Варашылаву**, ЦК КП(б)Б — т. **Гікало**, ураду БССР — тт. **Чарвякову і Галадзеду.**

По сканчэнні параду вайсковых часцей, у якім прымалі ўдзел пяхота, кавалерыя, артылерыя, броневі, танкі, пачалася магутная дэманстрацыя. У гэты дзень ля трыбун прайшлі сотні тысяч кіеўлян.

Магутныя дэманстрацыі адбыліся таксама ў Сталіно, у Запарожжы, Харкаве, Одасе і іншых гарадах Украіны.

Аб ходзе работ па выдачы дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй калгасамі

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР І ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленне наркамзема БССР т. Кароўнікава і загадчыка аддзелам землеўпарадкавання Наркамзема СССР т. Мінніка аб ходзе работ па выдачы калгасам дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй, СНК БССР і ЦК КП(б)Б канстатуюць:

1. Выкананне плана выдачы дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй калгасамі знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву: усяго па БССР замест 4.400 выдана 720 актаў; большасць раёнаў не выконвае намечанага ім плана, а некаторыя раёны да гэтага часу не выдалі ні аднаго акта (Круглянскі, Клічаўскі, Мехаўскі).

2. У пэлым радзе раёнаў райвыканкомы і райкомы КП(б)Б самаўхіліліся ад такой важнейшай справы, як зліццё і ўмацаванне дробных калгасаў, перадалі гэта палітычнае мерапрыемства землеўпарадчым атрадам (Чашнікі, Мсціслаўль), у рэзультаце чаго ў гэтых раёнах устаноўлены цэлы рад грубейшых скажэнняў статута сельскагаспадарчай арцелі і парушэнне калгаснай дэмакратыі, што выявілася ва ўстанаўленні граніц для групы калгасаў (калгасы «Ударнік»—74 двары, «Чырвоны барацьбіт» — 25 двароў і нацыянальны яўрэйскі калгас імя Барашылава — 26 двароў) да абмеркавання на агульных сходах калгаснікаў пытання аб зліцці.

3. У некаторых раёнах (Горкі, Мсціслаўль) начальнікі землеўпарадчых атрадаў (Рызаў і Балотнікаў) замест правядзення землеўпарадкавання калгасаў у адпаведнасці з інструкцыяй Наркамзема Саюза ССР, зацверджанай Саўнаркомам Саюза 7 ліпеня 1935 года, праводзілі землеўпарадкаванне цэлых населішчаў з выдзяленнем аднаасобнікаў з раду калгасаў на адзін зямельны масіў і нарэзкай ім сядзіб па нова-адведзеных землях, што прывяло на практыцы да ажыццяўлення контррэволюцыйнай прышчэпаўскай палітыкі—насаджэння хутароў і дробных пасёлкаў.

Прэзідыумы райвыканкомаў вышэйназваных раёнаў, не правяраючы, механічна штампавалі такія землеўпарадчыя праекты, чым па сутнасці прыкрывалі парушэнне інструкцыі Наркамзема Саюза ССР і насаджэнне хутароў.

4. Паміма вельмі марудных тэмпаў у ходзе землеўпарадчай падрыхтоўкі да складання і выдачы дзяржаўных актаў, у большасці раёнаў адзначаецца зусім недапушчальная нізкая якасць землеўпарадчых работ, складання і афармлення дзяржаўных актаў з грубымі тэхнічнымі памылкамі, памаркамі і хібамі, рад райвыканкомаў выносяць зусім няправільныя пастановы пры зацвярджэнні землеўпарадчых праектаў, — устанаўленне граніц землекарыстання калгасаў і замацаванне за калгасамі зямлі навечна (Бярэзань, Лепель, Барысаў, Менск і

адобранай сельгасаддзелам ЦК ВКП(б) і Наркамземам Саюза ССР аб мабілізацыі землеўпарадчыкаў для работ, звязаных з выдачай калгасам дзяржаўных актаў.

Аб невыкананні гэтай пастановы той ці іншай арганізацыяй у трохдзённы тэрмін перадаць справу на іх у камісіі Партыйнага і Совецкага Кантроля для прыцягнення да адказнасці.

4. СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць райкомы КП(б)Б, райвыканкомы, райзо і МТС усямерна дапамагаць землеўпарадчым атрадам у іх рабоце, ва ўстанаўленні цвёрдай службовай і працоўнай дысцыпліны сярод землеўпарадчага апарата, шырока развіваючы соцыялістычныя метады працы.

5. Праўленні калгасаў пад адказнасць старшынь абавязаны неадкладна прадастаўляць неабходную рабочую сілу землеўпарадчыкам (вылучэнне калгаснікаў для землеўпарадчых работ), забяспечваючы апошніх сродкамі перасоўвання, прадастаўляць абсталяваныя памяшканні для работы землеўпарадчыкаў, а таксама для іх жылля.

У выпадку невыканання праўленнямі калгасаў абавязацельстваў па аказанню дапамогі ў рабоце землеўпарадчых атрадаў (прадастаўленне рабочай сілы, перавозачных сродкаў, загатоўка слупоў, прадастаўленне памяшканняў для работы і жылля), райвыканкомы павінны прымаць самыя рашучыя меры аж да прыцягнення вінаватых да адказнасці, як за зрыў важнейшага мерапрыемства, звязанага з выдачай дзяржаўных актаў.

6. Забараніць землеўпарадчым атрадам выконваць якую-б там ні было работу, не звязаную з выдачай калгасам дзяржаўных актаў.

Усіх асоб, праводзячых іншыя работы або прымушаючых землеўпарадчыкаў да выканання іншых работ, прыцягваць да судовай адказнасці. Пракурору рэспублікі т. Кузьміну даць адпаведнае распараджэнне па сваёй лініі.

7. Райвыканкомы і райкомы КП(б)Б абавязаны ажыццяўляць непасрэднае і штодзённае кіраўніцтва такой важнейшай палітычнай справай, як зліццё, умацаванне дробных калгасаў, упягваючы ў гэту справу мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі і ні ў якім выпадку не перадаваючы гэту справу адным толькі землеўпарадчыкам, ведучы рашучую барацьбу супроць грубага адміністравання і парушэння калгаснай дэмакратыі.

8. Устанавіць падэкадную інфармацыю па сістэме Наркамзема аб ходзе работ па выдачы калгасам дзяржаўных актаў.

Абавязаць старшынь райвыканкомаў забяспечыць прадстаўленне з раёнаў адпаведных ве-

ДЭМАНСТРАЦЫЯ БЯЗМЕЖНАЙ ЛЮБВІ І АДДАНАСЦІ РОДНАМУ СТАЛІНУ

ВІЦЕБСК, 9 лістапада. (Кар. «Звязды»). Яшчэ з вечара 6 лістапада цэнтральныя вуліцы горада, яго ўскраіны прынялі ўрачысты, святочны выгляд.

У 7 гадзін вечара ў клубе панчошнікаў адкрыўся ўрачысты пленум горсовета сумесна з стахановамі фабрык і заводаў. Першае слова ўдзельнікаў пленума— да вялікага **Сталіна**. Правадыру працоўных усяго свету пад бурную доўга незмаўкаемую авацыю пасылаецца прывітальная тэлеграма.

З вялікім дакладам «18 год Кастрычніка» выступіў сакратар гаркома партыі тав. **Жураўлёў**.

Горача сустрэлі ўдзельнікі пленума дарагіх гасцей — прадстаўнікоў італьянскага пролетарыята, дэлегатаў VII кангрэса Камінтэрна тт. **Піні і Карлі**.

Пад бурныя апладысменты ўрачысты пленум пасылае прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б — т. **Гікало** і ўрачыстаму пленуму Менскага горсовета.

7 лістапада ў 11 гадзін раніцы на пляцы імя Леніна адбыўся парад войск віцебскага гарнізона. Прымаўшы парад т. Сазантаў павіншаваў чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў з 18-й гадавінай Вялікага Кастрычніка.

К пляцу Леніна ідуць бясконцыя калоны працоўных Віцебшчыны. У першай калоне на легкавых аўтамабілях стахановцы віцебскіх прадпрыемстваў.

Высока ўзнімаецца над паўтаратысячнай арміяй стахановцаў вялікі партрэт таварыша **Сталіна** з яго мудрым гістарычным лозунгам «Кадры вырашаюць усё».

Чыгуначнікі горда нясуць упярадзе партрэт любімага наркома т. **Кагановіча**. Цудоўна афармлена калона трохтысячнага рабочага калектыва панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ». Упярадзе пяцітысячнага рабочага калектыва швейнай фабрыкі «Сняг індустрыялізацыі» лозунг «За фабрыку імя Сталіна». Ініцыятары соцыяльных сталінскіх брыгад вядуць барацьбу за прысваенне ўсёй фабрыцы імя вялікага правадыра.

Бесперапынным патокам ідзе калона за калонай.

Звыш 40.000 працоўных прынялі ўдзел у Кастрычніцкай дэманстрацыі.

СВЯТКАВАННЕ Ў ГОМЕЛІ

ГОМЕЛЬ, 9 лістапада. (БЕЛТА). З самай раніцы Совецкую вуліцу і пляц Леніна пачалі запаўняць працоўныя горада. Больш 40 тысяч працоўных Гомеля выйшлі 7 лістапада на дэманстрацыю. Калоны дэманстрантаў узначальвалі лепшыя ўдарнікі-стахановцы. Наперадзе ішлі рабочыя прадпрыемстваў, датэрмінова выканаўшых гадавую праграму: Гомсельмаша, дрэвакамбіната імя Гікало, завода «Пролетарый» імя Кірава і інш.

Асобнай калонай дэманструюць шчаслівыя юнакі Краіны Советаў — равеснікі Кастрычніка. Ваяўніча праходзіць калона варашылаўскіх стралкоў, каманда асоавіяхімаўцаў у супрацьгазах.

Найбольш цікава афармлена калона рабочых харчовага камбіната «Спартак». Лозунгі, партраты правадыроў — усё ўпрыгожана вырабамі камбіната. Шмат люстраў уласнай вытворчасці неслі рабочыя шклозавода імя Сталіна.

Напярэдадні 7-га лістапада ў тэатры імя Леніна адбыўся ўрачысты пленум горсовета. Пленум віталі прадстаўнікі перадавых прадпрыемстваў горада, калгаса «Чырвоны хлебароб» і равеснікі Кастрычніка.

ЦЭХ ВЫСОКАЯКАСНЫХ ВАРШТАТАЎ

8 лістапада на менскім варштатабудаўнічым заводзе імя **Кірава** адбылося ўрачыстае адкрыццё новага механа-зборачнага цэха.

На адкрыццё прыбылі старшыня Саўнаркома БССР т. **Галадзед**, загадчык прамыслова-транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б т. **Готфрыд**, намеснік старшыні СНК БССР і старшыня Дзяржплана БССР тав. **Любовіч**, сакратар Менскага гаркома партыі т. **Рыскін**, парком мясцовай прамысловасці т. **Балцін**, тт. **Хадасевіч, Георгадзе**, сакратар оргбюро Сталінскага райкома партыі т. **Літвін** і прадстаўнікі фабрык і заводаў сталіцы.

Новы цэх займае вялікую тэрыторыю. Аб'ём пабудовы — 47 тысяч кубаметраў, карысная плошчы — 4.200 квадратных метраў. Пры поўнай праектнай магутнасці ў новым цэху будзе працаваць 500 чалавек.

Цэх будзе даваць высокакласныя варштаты, якія раней увозіліся з-за мяжы. Тэхнічная магутнасць цэха дазволіць да канца года выпусціць 5 нова-асвоеных гайканарэзных аўтаматаў, 6 цэнтравальных варштатаў, 23 аднаметровыя цэнтравальныя варштаты, 43 нажовачныя, 16 працяжных варштатаў і 2.900 паралельных

XVIII ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ Ў МЕНСКУ.

Рабочыя калоны, праходзячыя каля трыбуны, вітаюць кіраўнікоў партыі і ўрада.

Фото ФРЫДМАНА.

ХОД СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ ПА БССР НА 5 лістапада 1935 года

Раёны	Загатоўлена: ільновалакна	Загатоўлена: бульбы	Абмалочана збожжавых	Узята зяблі за	Узята пялёны	Закладзена
1. Менскі	100,5	100,2	60,2	100,0	80,0	100,5
2. Касцюковіцкі	100,5	100,8	85,6	78,9	29,8	96,4
3. Талачынскі	80,6	94,0	86,4	83,9	85,2	155,2
4. Аршанскі	84,7	99,6	78,7	102,7	69,5	194,3
5. Церахаўскі	86,5	96,6	100,0	86,5	30,1	91,5
6. Сенненскі	74,9	85,9	70,3	51,2	77,0	93,6
7. Крычаўскі	67,8	95,2	84,4	74,8	32,3	98,1
8. Полацкі	83,0	82,0	96,5	63,9	35,4	81,0
9. Чавускі	46,5	95,0	83,8	65,8	67,1	101,1
10. Ветрынскі	58,1	81,2	92,5	72,2	46,7	137,2
11. Чашніцкі	54,2	89,4	72,9	51,2	49,8	82,3
12. Пухавіцкі	47,9	94,0	100,0	85,1	75,2	143,4
13. Асвейскі	27,0	89,9	85,6	54,0	25,3	55,2
14. Бешанковіцкі	35,8	90,8	70,4	61,9	57,6	92,4
15. Мсціслаўскі	30,1	82,1	85,0	76,2	24,1	87,7
16. Суражскі	50,9	83,9	85,6	50,5	75,9	83,1
17. Горацкі	40,4	93,6	100,0	92,0	100,0	112,6
18. Лёзнянскі	32,3	75,0	93,8	51,1	56,4	78,9
19. Дрысенскі	30,4	100,3	87,0	75,8	40,5	97,2
20. Круглянскі	40,6	82,3	100,1	70,1	74,9	110,5
21. Прапойскі	68,2	84,2	92,6	84,4	69,4	134,0
22. Лепельскі	40,7	86,1	93,1	61,0	41,0	94,0
23. Хоцімскі	40,6	94,6	88,5	80,7	61,8	82,2
24. Кармянскі	27,9	79,4	84,8	58,2	51,9	101,6
25. Расонскі	20,2	77,5	90,0	60,0	52,3	89,9
26. Сіроцінскі	35,6	84,0	84,4	49,4	36,8	72,1
27. Клімавіцкі	61,3	96,8	81,6	82,1	43,5	91,3
28. Бялыніцкі	60,9	92,0	95,2	75,6	67,6	123,5
29. Крупскі	42,9	88,0	92,0	68,5	85,1	106,4
30. Уваравіцкі	33,1	93,8	84,3	69,5	37,0	108,2
31. Шклоўскі	28,0	95,0	95,7	69,2	30,5	90,4
32. Чырвонапольскі	15,5	85,1	90,0	69,5	65,4	108,8
33. Чырвонаслабодскі	55,3	101,9	68,0	81,3	62,8	89,9
34. Лоеўскі	54,1	92,2	89,0	100,7	101,1	97,7
35. Гарадоцкі	36,4	93,6	95,0	67,9	61,2	98,2
36. Рагачоўскі	14,7	94,0	86,4	88,9	37,0	90,6
37. Ельскі	51,4	96,3	91,7	75,6	96,9	112,0
38. Кіраўскі	17,7	88,2	86,0	66,6	83,9	80,7
39. Б.-Хацежскі	51,1	93,7	90,7	75,8	58,9	75,2

АБ 14-М ПУНКЦЕ СТАТУТА СЕЛЬГАСАРЦЕЛІ

(ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПІСЕМ СЕЛЬКОРАЎ).

Найвялікшы стратэг большэвізма таварыш **Сталін** у сваёй гістарычнай прамове сказаў:

«Жанчыны складаюць палову насельніцтва нашай краіны, яны складаюць велізарную армію працы, і яны закліканы выхоўваць нашых дзяцей, наша будучае пакаленне, гэта значыць нашу будучыню».

У Краіне Советаў працоўную жанчыну акружаюць клопаты партыі, урада і правадыра ўсяго народу таварыша **Сталіна**.

Найвялікшым сведчаннем гэтых клопатаў з'яўляецца прыняты на другім усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў, па прапанове таварыша Сталіна, пункт новага, Прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі, паводле якога жанчыны-калгаснікі вызваляюцца за месяц да родаў і на месяц пасля родаў ад работы, з захаваннем у палавінным размеры сярэдняй выпрацоўкі працадзён.

У перадавых калгасах БССР, выконваючых сталінскі статут, калгаснікі сапраўды атрымліваюць адпачынак да і пасля родаў. У часе родаў ім аказваецца медыцынская дапамога. Лепшыя калгасы абсталявалі добрыя хаты-радзільні, дзіцячыя яслі і пляцоўкі, акружылі мацярэй вялікімі клопатамі і ўвагай.

Ада пісьмы нашых селькораў з

ССР і насаджэнне хутароў.

4. Паміма вельмі марудных тэмпаў у ходзе землеўпарадчай падрыхтоўкі да складання і выдачы дзяржаўных актаў, у большасці раёнаў адзначаецца зусім недапушчальная нізкая якасць землеўпарадчых работ, складание і афармленне дзяржаўных актаў з грубымі тэхнічнымі памылкамі, памаркамі і хібамі, рад райвыканкомаў выносяць зусім няправільныя пастановы пры зацвярджэнні землеўпарадчых праектаў, — устанаўленне граніц землекарыстання калгасаў і замацаванне за калгасамі зямлі навечна (Бягомль, Лепель, Барысаў, Менск і рад іншых раёнаў).

Гэта сведчыць аб тым, што як зямельныя работнікі, так і раённае кіраўніцтва недаацанілі палітычнай важнасці тэхнічнага афармлення актаў і, дапускаючы гэтыя хібы ў рабоце, садзейнічалі зніжэнню палітычнай важнасці і аўтарытэту гэтага важнейшага дзяржаўнага акта.

5. У радзе раёнаў землеўпарадчыкам да гэтага часу не створаны неабходныя ўмовы для поспяховага выканання землеўпарадчых работ, не прадастаўляюцца своечасова сродкі перасоўвання, рабочыя для правядзення землеўпарадчых работ і памяшканні для чарцёжных і жылля, а таксама зусім адсутнічаюць клопаты аб іх матэрыяльным і культурным абслугоўванні.

6. Усё гэта сведчыць аб тым, што, не гледзячы на неаднаразовыя папярэджанні СНК БССР і ЦК КП(б)Б, цэлы рад старшынь райвыканкомаў і сакратароў райкомаў КП(б)Б да гэтага часу не зразумелі ўсёй палітычнай важнасці пытання выдачы калгасам дзяржаўных актаў, падыйшлі да гэтага пытання фармальна-бюракратычна.

7. СНК БССР і ЦК КП(б)Б адзначаюць, што да апошняга часу з боку Наркамзема БССР не было належнага аператыўнага кіраўніцтва землеўпарадчымі работамі, да гэтага часу не арганізаваны належны кантроль, інструктаж, практычная дапамога і своечасовае выпраўленне недахопаў у рабоце землеўпарадчых атрадаў і раённых арганізацый у справе падрыхтоўкі і выдачы калгасам дзяржаўных актаў.

Надаючы выключнае палітычнае значэнне своечасовай выдачы калгасам дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй, іх высокаякаснай падрыхтоўцы і афармленню, СНК БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Склікаць на 10 лістапада 1935 г. рэспубліканскую нараду старшынь райвыканкомаў, загадчыкаў райза і старшых землеўпарадчыкаў па пытанню выдачы калгасам дзяржаўных актаў.

2. Абавязаць Наркамзем (т. Бенека) арганізаваць аператыўнае кіраўніцтва землеўпарадчымі работамі і ўстанавіць сістэматычны кантроль-інструктаж землеўпарадчых атрадаў, РВК і райза па выдачы калгасам дзяржаўных актаў.

У дзесяцідзённы тэрмін умацаваць апарат аддзела землеўпарадкавання высокакваліфікаванымі спецыялістамі і поўнасцю ўкамплектаваць інспектарскі сатаў. Накіраваць у распараджэнне Наркамзема БССР тт. Кавалёва і Палубінскага для скарыстання іх на рабоце па землеўпарадкаванню.

3. Абавязаць асабіста сакратароў райкомаў КП(б)Б і старшынь РВК праверыць выкананне пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б,

насаджэнне лесаахоўных палос, ліквідацыі дробных калгасаў, упягваючы ў гэту справу мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі і ні ў якім выпадку не перадаваючы гэту справу адным толькі землеўпарадчыкам, ведучы рашучую барацьбу супроць грубага адміністравання і парушэння калгаснай дэмакратыі.

8. Устанавіць падэкадную інфармацыю па сістэме Наркамзема аб ходзе работ па выдачы калгасам дзяржаўных актаў.

Абавязаць старшынь райвыканкомаў забяспечыць прадстаўленне з раёнаў адпаведных вестак Наркамзему ў дакладна ўстаноўленыя тэрміны.

9. Абавязаць Наркамунутгандаль (т. Гурэвіча) і Белкаапсаюз (т. Баскіна) адпусціць у трохдзённы тэрмін па развёрстцы Наркамзема 600 пар абутку і 600 шт. брэзентавых плашчоў.

10. За зрыў выдачы калгасам дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй (пры наяўнасці 32 землеўпарадчыкаў выдан на 1 лістапада 1935 г. адзін акт), за парушэнне інструкцыі Наркамзема Саюза ССР і сістэматычнае невыкананне загадаў наркома земляробства, прывёўшых да скажэння землеўпарадкавання (стварэнне новых хутароў) начальніка мсціслаўскага землеўпарадчага атрада т. Балотнікава з радоў партыі выключыць і зняць з работы.

11. Папярэдзіць старшынь райвыканкомаў, загадчыкаў райза і старшых землеўпарадчыкаў, аб тым, што яны нясуць персанальную адказнасць як за своечасовае выкананне ўстаноўленага плана, так і за якасць падрыхтоўкі і выдачу калгасам дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР Н. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б.
Н. ГІКАЛО.

8 лістапада на менскім варштатабудаўнічым заводзе імя **Кірава** адбылося ўрачыстае адкрыццё новага механа-зборачнага цэха.

На адкрыццё прыбылі старшыня Соўнаркома БССР т. **Галадзед**, загадчык прамыслова-транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б т. **Готфрыд**, намеснік старшыні СНК БССР і старшыня Дзяржплана БССР тав. **Любовіч**, сакратар Менскага гаркома партыі т. **Рыскін**, нарком мясцовай прамысловасці т. **Балцін**, тт. **Хадасевіч, Геаргадзе**, сакратар оргбюро Сталінскага райкома партыі т. **Літвін** і прадстаўнікі фабрык і заводаў сталіцы.

З прывітальнымі прамовамі выступілі тт. **Галадзед, Хадасевіч, Геаргадзе, Левін**, стаханаўцы **Гімельштэйн**, стары слесар **Егораў** і інш.

Новы цэх займае вялікую тэрыторыю. Аб'ём пабудовы — 47 тысяч кубаметраў, карысная плошчы — 4.200 квадратных метраў. Пры поўнай праектнай магутнасці ў новым цэху будзе працаваць 500 чалавек.

Цэх будзе даваць высокаякасныя варштаты, якія раней увозіліся з-за мяжы. Тэхнічная магутнасць цэха дазволіць да канца года выпусціць 5 нова-асвоеных гайканаразных аўтаматаў, 6 цэнтравальных варштатаў, 23 аднаметровыя цэнтравальныя варштаты, 43 наждачныя, 16 працяжных варштатаў і 2.900 паралельных ціскоў. Цэх мае самае новае і лепшае тэхнічнае абсталяванне вырабу совецкіх заводаў. Усе механізмы прыводзяцца ў рух маторамі. У цэху абсталяваны душ і цёплыя прыбіральні.

НА ПОЎНУЮ МАГУТНАСЦЬ

Свята Кастрычніцкай рэволюцыі на Белдрэсе было адзначана пускам чацвертага паравога катла і адкрыццём новай сталоўкі. Пуск чацвертага катла дае магчымасць безупынна працаваць на поўную магутнасць станцыі — 20.000 кіловат.

7 лістапада ў нова-адкрытай сталоўцы адбыўся ўрачысты вечар рабочых калектыва станцыі. Для ўдзелу ў святкаванні на Белдрэс прыбылі сакратар аршанскага райкома партыі т. **Соскін** і старшыня райвыканкома т. **Міцькоў**. 30 лепшых стаханаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў былі прэміраваны каштоўнымі падарункамі.

***

На **гомельскай** фабрыцы ложкаў да гадавіны Кастрычніка закончана пабудова ліцейнага і штамповачнага цэхаў.

На **барысаўскім** заводзе «Чырвоны металіст» закончана пабудова цэха бляшанай пасуды і рэканструкцыя астатніх цэхаў.

—о—

НОВЫ ДОМ ДЛЯ РАБОЧЫХ.

6 лістапада адбылося ўрачыстае адкрыццё двухпавярховага ўтульнага і добра абсталяванага інтэрната для рабочых менскай швэйнай фабрыкі імя Крупскай. Інтэрнат разлічан на 125 чалавек. Пры інтэрнаце абсталяваны чырвоны куток. За выключэннем двух пакояў увесь інтэрнат заселен дзяўчатамі — былымі выхаванкамі дзіцячых дамоў, якія зараз працуюць на фабрыцы.

XVIII ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ Ў МЕНСКУ.

Лепшым стаханаўцам менскіх прадпрыемстваў прадстаўлена было перадавое месца на свяце

НА ЗДЫМКУ: лепшыя стаханаўцы ля трыбуны. Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

21. Прапойскі	68,2	84,2	92,6	84,4	69,4	134,0
22. Лепельскі	40,7	86,1	93,1	61,0	41,0	94,0
23. Хоцімскі	40,6	94,0	88,5	80,7	61,8	82,2
24. Кармянскі	27,9	79,4	84,8	58,2	51,9	101,6
25. Расонскі	20,2	77,5	90,0	60,0	52,3	89,9
26. Сіроцінскі	35,6	84,0	84,4	49,4	36,8	72,1
27. Клімавіцкі	61,3	96,8	81,6	82,1	43,5	91,3
28. Бялыніцкі	60,9	92,0	95,2	75,6	67,6	123,5
29. Крупскі	42,9	88,0	92,0	68,5	85,1	106,4
30. Уваравіцкі	33,1	93,8	84,3	69,5	37,0	108,2
31. Шклоўскі	28,0	95,0	95,7	69,2	30,5	90,4
32. Чырвонапольскі	18,5	85,1	90,0	69,5	65,4	108,8
33. Чырвонаслабодскі	55,3	101,9	68,0	81,3	62,8	89,9
34. Лоеўскі	54,1	92,2	89,0	100,7	101,1	97,7
35. Гарадоцкі	36,4	93,6	95,0	67,9	61,2	98,2
36. Рагачоўскі	14,7	94,0	86,4	88,9	37,0	90,6
37. Ельскі	51,4	96,3	91,7	75,6	96,9	112,0
38. Кіраўскі	17,7	88,2	86,0	66,6	83,9	80,7
39. Б.-Кашалеўскі	51,1	95,7	90,7	75,8	58,9	75,2
40. Мехаўскі	22,5	93,5	90,6	55,7	74,1	88,3
41. Ушацкі	23,4	85,0	76,5	69,8	41,9	88,4
42. Смілавіцкі	24,1	94,3	91,1	62,2	87,8	86,6
43. Багушэўскі	31,2	78,5	87,2	55,1	100,3	126,9
44. Плешчаніцкі	46,0	90,7	79,7	55,6	43,9	115,5
45. Любаньскі	45,1	97,8	98,7	98,6	104,3	100,2
46. Добрушскі	17,4	98,0	99,6	79,7	88,0	138,0
47. Гомельскі	42,6	93,5	91,9	78,3	23,6	75,8
48. Халопеніцкі	12,2	82,8	96,3	54,1	67,3	103,1
49. Тураўскі	40,9	90,4	92,1	89,5	30,0	92,3
50. Грэскі	40,9	95,8	69,4	93,2	62,3	97,3
51. Магілеўскі	22,0	91,5	83,8	62,7	56,1	98,0
52. Дрыбінскі	40,6	93,5	90,5	71,0	90,0	107,1
53. Бабруйскі	13,4	90,0	90,3	115,8	100,1	100,0
54. Капыльскі	37,4	94,0	69,0	79,4	49,9	100,5
55. Парыцкі	28,1	84,5	86,1	61,2	62,0	85,0
56. Рэчыцкі	36,1	93,3	91,8	82,2	43,3	75,1
57. Слуцкі	35,0	97,4	67,4	80,5	58,6	82,6
58. Журавіцкі	18,1	94,1	89,2	63,1	39,4	114,5
59. Веткаўскі	34,6	103,9	89,1	68,8	22,7	106,9
60. Бярэзінскі	34,4	92,3	91,7	94,9	100,0	130,9
61. Брагінскі	33,9	94,5	81,7	89,9	35,4	95,9
62. Дубровенскі	33,1	90,3	78,4	65,5	31,9	85,0
63. Чэрыкаўскі	32,1	97,5	81,9	69,9	49,6	94,7
64. Бягомльскі	31,7	94,2	93,9	81,3	46,8	95,7
65. Хойніцкі	31,7	89,5	86,5	80,0	27,4	103,0
66. Мазырскі	31,2	89,2	89,6	72,8	34,5	106,5
67. Даманавіцкі	31,0	90,7	95,9	82,2	80,5	120,1
68. Нараўлянскі	30,1	106,7	89,2	71,1	92,1	86,0
69. Лельчыцкі	29,4	90,0	88,3	84,3	103,5	148,0
70. Свяцілавіцкі	29,4	90,6	95,0	66,4	30,3	86,7
71. Асіпавіцкі	28,6	91,2	82,7	58,6	29,2	155,5
72. Старобінскі	27,7	91,5	77,3	98,0	64,4	81,1
73. Петрыкоўскі	27,6	81,7	74,6	71,8	47,7	53,5
74. Смалявіцкі	25,5	91,0	98,0	75,2	70,3	100,4
75. Віцебскі-	25,8	81,7	92,0	58,3	55,5	86,9
76. Барысаўскі	25,0	91,5	91,3	105,1	64,4	118,6
77. Жлобінскі	23,2	87,2	87,1	71,7	42,7	69,2
78. Камарынскі	21,9	97,6	84,0	71,6	26,3	86,2
79. Лагойскі	21,5	85,3	74,6	80,4	37,9	102,7
80. Старадарожскі	21,1	80,2	100,0	90,3	99,6	90,0
81. Быхаўскі	20,1	97,1	87,5	82,1	50,0	82,6
82. Заслаўскі	18,8	94,9	67,1	90,0	26,2	95,6
83. Клічаўскі	18,0	91,1	98,3	60,6	39,8	67,8
84. Жыткавіцкі	17,1	97,5	80,7	82,7	18,3	115,7
85. Уздзенскі	16,4	100,3	74,0	94,4	13,0	100,3
86. Чачэрскі	15,6	94,0	80,5	80,8	11,8	74,4
87. Дзяржынскі	13,6	97,4	76,8	91,4	54,0	96,2
88. Чэрвеньскі	12,7	76,2	79,1	75,2	71,5	104,4
89. Глускі	12,5	86,5	77,2	54,3	46,5	68,4
90. Капаткевіцкі	8,1	68,0	85,2	63,7	47,7	113,4
УСЯГО ПА БССР:	38,0	91,2	86,1	73,9	56,0	99,5
Было на 30 кастрычніка 1935 г.	26,7	89,3	85,3	69,0	56,8	98,0
Было на 5 лістапада 1934 г.:	63,8	90,3	87,6	105,2	—	—

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫЯ АДДЗЕЛЫ НКЗ І УПАУКАМЗАГА БССР.

—□□□—

ДЭЛЕГАЦЫЯ ШАХЦЁРАЎ ДАНБАСА Ў ЧАВУСАХ

ЧАВУСЫ, 9 лістапада. (Кар. «Звязды»). Па-святочнаму сустрэў горад гадавіну Кастрычніка. Вулицы былі ўпрыгожаны сцягамі, лозунгамі і партрэтамі правадыроў. 7 лістапада адбылася пяцітысячная дэманстрацыя працоўных.

На Кастрычніцкае свята ў раён прыехала дэлегацыя шахцёраў Данбаса ў складзе тт. Пашчанка, Петрачэнка і Майсеенка. У гутарцы з вашым карэспандэнтам кіраўнік дэлегацыі т. Пашчанка заявіў, што мэтай прыезду дэлегацыі з'яўляецца перадача вопыту работы стаханаўцаў Данбаса калгасам і соўгасам Чавускага раёна. Дэлегаты наведалі калгасы «Пролетарый» і «Перабудова», дзе ў Кастрычніцкае свята ўручаўся акт на вечнае карыстанне зямлёй. Дэлегацыя Данбаса рашыла заключыць соцыялістычны дагавор на разгортванне стаханаўскага руху з дэлегацыяй калгаснікаў Чавускага раёна, якая выехала на свята ў Данбас.

Таварыша Сталіна, пункт новага, Прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі, паводле якога жанчыны-калгасніцы вызваляюцца за месяц да родаў і на месяц пасля родаў ад работы, з захаваннем у палавінным размеры сярэдняй выпрацоўкі працадзён.

У перадавых калгасах БССР, выконваючых сталінскі статут, калгасніцы сапраўды атрымліваюць адпачынак да і пасля родаў. У часе родаў ім аказваецца медыцынская дапамога. Лепшыя калгасы абсталявалі добрыя хатырадзільні, дзіцячыя яслі і пляцоўкі, акружылі мацярэй вялікімі клопатамі і ўвагай.

Але пісьмы нашых селькораў з некаторых раёнаў сведчаць аб тым, што ў многіх калгасах пункты статута адносна аховы мацеры і дзіцяці не выконваюцца.

Характэрным прыкладам можа паслужыць калгас «Пабеда», Папернянскага сельсовета, Менскага раёна. У гэтым калгасе самым грубым чынам парушылі 14 пункт статута аб прадстаўленні адпачынку цяжарным калгасніцам. Старшыня калгаса Юшкевіч у сваёй нахабнасці дайшоў да таго, што прычыны ўсіх прарываў у калгасе і яго адставанне ён бачыць толькі ў адным — у цяжарных жанчынах. Гэта яго словы. А вось і справы.

Калгасніца Юшкевіч Спепаніда павінна была быць вызвалена ад работы яшчэ ў верасні. Па загаду старшыні кожную раніцу да яе прыходзіў брыгадзір і загадваў ісці на работу. Брыгадзір запалохваў Спепаніду, што ў праціўным выпадку яна і яе сям'я будуць выключаны з калгаса. Спепаніда працавала да самых родаў.

Аб агіднейшых, бяздушных адносінах да жывога чалавека і грубым парушэнні сталінскага статута паведамляе і тав. Стральцоў з калгаса «Інтэрнацыянал», Васюкевіцкага сельсовета, Прапойскага раёна. Калгасніцу Мельнікаву Просю і Стральцову Мар'ю да самых родаў прымушалі штодзённа хадзіць на работу. Не прайшло і тыдня пасля родаў, як да Мельнікавай на кватэру з'явіліся старшыня калгаса і брыгадзір, і Просі быў прад'яўлен ультыматум: або яна выходзіць неадкладна на капанне бульбы, або яе і мужа выключаюць з калгаса. Запалоханая калгасніца, не аправіўшаяся пасля родаў, пашла на работу.

Такія-ж факты мелі месца і ў калгасе «Свабода», Кадзішчанскага сельсовета, Гарадоцкага раёна.

— Будзем штрафаваць, калі ты не выйдзеш на работу,—пагражаў старшыня калгаса Гудзялевіч калгасніцы Драздовай. Пад пагрозай штрафу Драздова хадзіла на работу да самых родаў.

Паданыя вышэй факты сведчаць аб парушэнні многімі кіраўнікамі калгасаў пункту сталінскага статута калгаснага жыцця, які датычыць аховы мацеры і дзіцяці. Ёсць яшчэ старшыні калгасаў, якія дагэтуль не зразумелі, што сталінскі статут калгаснага жыцця — гэта непарушны закон.

Усякі, хто пасягае на гэты закон, павінен быць прыцягнут да найстражэйшай адказнасці.

Зямельныя органы, органы аховы здароўя і пракуратура павінны быць на варце інтарэсаў калгаснік.

ХVIII ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ Ў МЕНСКУ.

Рабочыя і работніцы Менска на дэманстрацыю прышлі з кветкамі.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

Кастрычніцкія святы ў гарадах і раёнах БССР

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ У ПЕРШЫХ РАДАХ

МАГІЛЕЎ, 9 лістапада. (**Кар. «Звязды»**). Фабрыкі, заводы, будынкі горада ўпрыгожаны партрэтамі правадыроў, чырвонымі палотнішчамі сцягаў і лозунгаў. Раніца 7 лістапада. На мясцах збору разносяцца бадзёрыя песні і гоман. Гукі аркестраў сплятаюцца з песнямі і смехам.

Бягуць мінуты. У поўдзень пачынаецца парад. Праходзяць байцы, камандзіры. Доўгім магутным «ура» сустракаюць праноўныя Магілеўшчыны часці сваёй любімай Чырвонай арміі.

У першых радах калоны навуковай фабрыкі імя Куйбышэва са сцягамі ідуць героі першай фабрычнай пяцігодкі, стаханаўцы тт. Бараноўскі, Лыскоўская, Лісцына, Сяргеенка, Казлоўская.

Над фабрычнай калонай асоавіяхімаўцаў, планерыстаў, фізкультурнікаў партрэты таварышоў Леніна, Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Орджанікідзе, Калініна, Гікало, Галадзеда. Партрэты тт. Леніна і Сталіна вышыты шоўкам.

Упершыню горад убачыў калону прадпрыемстваў, якія датэрмінова выканалі гадавы промфінплан. У калоне перадавікоў завод імя Сталіна, рымарная і кандзіцерская фабрыкі, сушыльны, лесапільны, піваварныя заводы і мясакамбінат.

Дэманстрацыя заканчваецца, але горад безупынна крынічыць Кастрычніцкай урачыстасцю. У стаханаўца скурзавода тав. Мядзведзева вечар. Дзесяткі рабочых і работніц горада запрасілі на свята да сябе калгаснікаў падшэфных калгасаў, чырвонаармейцаў, выхаванцаў дзіцячых дамоў.

Многія калгасы выканалі да свята план здачы ільновалакна. У калгасе «Чырвонаармеец», Амхоўскага сельсовета, калгасны духавы аркестр даў канцэрт. 30 калгаснікаў калгаса «Колас», Гарадзішчанскага сельсовета, усяліліся ў новыя хаты цэнтральнага калгаснага пасёлка. У калгасе імя Якаўлева, Цішоўскага сельсовета, адкрыт дом соцкультуры.

12 ТЫСЯЧ дэманстрантаў

ОРША, 9 лістапада. (**Кар. «Звязды»**). Да кастрычніцкіх свят Аршаншчына прышла з вялікімі дасягненнямі. Па раёну перанесены ў цэнтры калгасаў 532 хутары, пабудаваны 65 культурных калгасных лазняў. Рабочыя механічнага завода «Чырвоны барацьбіт» і кахляна-плітачнага завода «Пролетарый» датэрмінова да 18-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі выканалі гадавы промфінплан. 103 перадавыя калгасы раёна — удзельнікі паходу імя т. Гікало за лён — поўнасцю выканалі план ільнозагатовак.

7 лістапада тысячы рабочых, служачых і студэнтаў у лепшым святочным адзенні вышлі на дэманстрацыю. Радасна гучаць песні і музыка, прывітальныя лозунгі. Агульную ўвагу прыкоўвае да сябе калона чыгуначнікаў, якая вельмі прыгожа афармлена. Пачэснае месца ў радах дэманстрантаў занялі рабочыя ільнокамбіната — лепшыя стаханаўцы тт. Верхаводзін, Баранаў, Уткін. Удзельнікі калоны студэнтаў рабфака, белпедтэхнікума і педагагічнага інстытута нясуць макеты значкоў варашылаўскага стралка, партрэты правадыроў.

Пачынае імгліць невялічкі дождж, але ніхто з дэманстрантаў яго не заўважае. Людзі танцуюць і весяляцца. Калоны стройна праходзяць каля трыбуны, адкуль дэманстрантаў вітаюць кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый раёна. Раздаецца громкае «ўра». Зноў гучаць радасныя песні.

—о—

МІТЫНГ ПРАЦОЎНЫХ БАРЫСАВА

БАРЫСАЎ, 9 лістапада. (**Кар. «Звязды»**). Раніцой 7 лістапада з усіх канцоў горада ў цэнтр сцягваліся мастацкі афармленыя калоны працоўных Барысава. У галаве калоны запалкавай фабрыкі імя Кірава ішлі стаханаўцы тт. Шчуцкая, Курлянін і іншыя. Яны неслі партрэты правадыроў, зробленыя з запалак. Дрэваапрацоўчы камбінат «Комінтэрн» нёс прадукцыю вытворчасці сваіх цэхаў. Стаханаўцы лесазавода імя Молатава неслі гатовае піяніна свайго вырабу. Лепш за ўсіх была мастацкі афармлена калона рабочых шклянога завода імя Домбаля.

У 11 гадзін на плошчы адбыўся мітынг, дзе выступілі прадстаўнікі райкома КП(б)Б і райвыканкома. У дэманстрацыі прынялі ўдзел звыш 15 тысяч працоўных Барысава.

—о—

СВЯТА НА ГРАНІЦЫ

КАПЫЛЬ, 9 лістапада. (**Кар. «Звязды»**). 7 лістапада ў раённым цэнтры адбылася трохтысячная дэманстрацыя рабочых, служачых і калгаснікаў, членаў промарцелей і школьнікаў мястэчка. У в. Пясочнае 6 лістапада ўпершыню загарэлся лямпка Ільіча. Закончана будаўніцтва новых памяшканняў сельсавета і дома соцыялістычнай культуры. У пагранічным калгасе «Ільіч», Бабаўнянскага сельсавета, адкрыт дом культуры.

РАДАСЦЬ УРАЧЫСТАСЦІ

БАБРУЙСК, 9 лістапада. (**Кар. «Звязды»**). Наперакор дрэннаму надвор'ю, стройныя калоны дэманстрантаў 7 лістапада арганізавана, з песнямі і музыкай крочылі к месцу парада.

Рабочыя лесакамбіната на грузавіку абсталявалі «карабль», на якім едуць лепшыя стаханаўцы. За рулём карабля, які сімвалізуе СССР, стаіць таварыш **Сталін**. Гідролізнікі нясуць гіганцкі партрэт тав. Сталіна і членаў Палітбюро. Мэбельшчыкі ўпрыгожылі сваю калону безліччу мастацкі выразаных на фанеры лозунгаў. Арыгінальны герб з прадуктаў сельскай гаспадаркі нясуць калгаснікі калгаса «Чырвоная Бярэзіна». Калоны афармлены на тэму: «Мы магутны, мы бацькаўшчына сусветнага пролетарыята, намі кіруе непераможная вялікая партыя Леніна—Сталіна».

Пролетарыі Бабруйска сёння асабліва радасныя: 15 прадпрыемстваў, уключаючы лесакамбінат, фанерны завод імя Кірава, датэрмінова выканалі гадавы промфінплан.

Пачынаецца парад войск гарнізона. Ідуць, узяўшы вінтоўкі «на руку», маладыя, толькі ўступіўшыя ў рады Чырвонай арміі байцы. Яны «рубяць» крок, яны пасылаюць грамавое «ўра» любімаму Сталіну, сталінскаму ЦК. На рысаках праходзіць артылерыя розных калібраў — усё гэта дэманстравала несакрушальную магутнасць Чырвонай арміі, яе гатоўнасць у любую мінуту стаць на абарону бацькаўшчыны сусветнага пролетарыята.

Парад войск прымалі т. Грыбаў, т. Калпакчы, сакратар РК КП(б)Б т. **Чэрнышоў** і інш. Яны віталі байцоў, пролетарыяў і дэманстраваўшых працоўных Бабруйска з 18-й гадавінай Кастрычніка.

ШМАТЛІКІЯ МІТЫНГІ І ДЭМАНСТРАЦЫІ У РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ

МАЗЫР, 9 лістапада. (**Кар. «Звязды»**). Не гледзячы на дрэннае надвор'е, ва ўсіх раённых цэнтрах Мазырскай акругі 7 лістапада адбыліся шматлікія мітынгі і дэманстрацыі, прысвечаныя XVIII гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі.

У Мазыры на дэманстрацыю вышла каля 10 тысяч чалавек. На мітынгу, які адбываўся на Пляцу Волі, дэманстрантаў віталі кіраўнікі акруговых і раённых партыйных і совецкіх арганізацый.

дзях красавалася ганаровая лічба «18».

***

РАГАЧОЎ, 9 лістапада. (**Кар. «Звязды»**). Пролетарскае свята Рагачоўскі раён сустрэў вытворчымі перамогамі. Картонная фабрыка імя Сталіна датэрмінова выканала гадавы план. Выканалі сваю дзесяцімесячную праграму лесазавод імя Халтурына, райпромкамбінат, промарцель «Лб'яванне» і іншыя. 16 калгасаў размінова выканалі гадавы промфінплан.

ПРЫЁМЫ Ў СОВЕЦКІХ ПАУПРЭДСТВАХ

Прыёмы ў сувязі з святкаваннем 18 гадавіны Вялікай пролетарскай рэволюцыі адбыліся ў совецкіх паўпрэдствах ва Францыі, Турцыі, Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Балгарыі, Румыніі, Японіі, Кітаі, Індыі, Афганістане, Персіі, Іспаніі, Мексіцы, Аргентыне, Бразіліі, Чылі, Уругвае, Парагвае, Эквадоры, Перу, Балівіі, Калумбіі, Венесуэле, Кубе, Гаіці, Доміканскай Рэспубліцы, Гватэмале, Гондурасе, Сальвадоры, Коста-Рыцы, Панаме, Никарагуа, Злучаных Штатах Паўночнай Амерыкі, Канадзе, Мексіцы

та, ён указваў на Парыжскую комуну. Сёння тым, хто пытаецца, што такое сацыялізм, можна адказаць: **паглядзіце на Совецкі Саюз».**

Фрашон прысвячае сваю прамову дасягненням СССР у галіне паляпшэння становішча працоўных мас. Член кіраўніцтва, фран-

калькі раз павялічыўшая свае сілы, з'яўляецца **апорай міру супроць вайны і імперыялізма.** Ніхто не можа сказаць, што наш вялікі сусед заняты чым-небудзь іншым, чым стварэннем шчасця свайго народу, незалежнасці, спакою і роўнасці народаў сваёй краіны».

ПРЫЁМЫ Ў СОВЕЦКІХ ПАЎПРЭДСТВАХ

Прыёмы ў сувязі з святкаваннем 18 гадавіны Вялікай пролетарскай рэвалюцыі адбыліся ў совецкіх паўпрэдствах ва Францыі, Японіі, Румыніі, Кітаі і ў Эстоніі.

⊙ На прыёме, наладжаным паўпрэдам СССР у **Парыжы** тав. Пацёмкіным, прысутнічалі члены французскага ўрада — міністры Мандэль, Рустан, Фросар, Катала, Лямурэ і Брандон, прадстаўнік прэм'ер-міністра Лаваля Ларан-Эйпак, дыпламатычны корпус у поўным складзе, віднейшыя прадстаўнікі французскай грамадскасці, навукі, літаратуры, мастацтва, палітычнага і фінансавага свету, а таксама віднейшыя прадстаўнікі арміі і флота.

⊙ На прыёме ў паўпрэдстве СССР у **Токіо** прысутнічалі шматлікія прадстаўнікі палітычных і дзелавых колаў, у тым ліку японскі міністр замежных спраў Хірота, таварыш міністра замежных спраў Сігеміцу і інш.

⊙ На прыёме ў паўпрэдстве СССР у **Бухарэсце** прысутнічалі члены румынскага ўрада, члены дыпламатычнага корпуса, прадстаўнікі вышэйшых ваенных улад і шматлікія прадстаўнікі палітычных і грамадскіх колаў; у прыватнасці прысутнічаў міністр замежных спраў Тытулеску, міністр унутраных спраў Інкулец, ваенны міністр Ангелеску і інш.

⊙ На прыёме, наладжаным паўпрэдам СССР у **Кітаі** тав. Багамолавым у Нанкіне, сярод гасцей былі: старшыня заканадаўчага юаня (палаты) Сунь Фо, міністры нанкінскага ўрада, прадстаўнік Чан Кай-шы, дыпламатычны корпус у поўным складзе, прадстаўнікі грамадскіх, палітычных, дзелавых і навуковых колаў.

⊙ На прыёме ў паўпрэдстве СССР у **Эстоніі** прысутнічала звыш 250 чалавек — прадстаўнікі ўрада, дыпламатычнага корпуса, гаспадарчага, ваеннага і культурнага свету Эстоніі.

⊙ Паўпрэдствам СССР у **Швецыі** ў сувязі з 18-й гадавінай Вялікай пролетарскай рэвалюцыі атрыманы шматлікія віншаванні ад розных колаў шведскай грамадскасці.

ВАЙНА Ў АБІСІНІІ

Зводка ваенных дзеянняў

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Згодна паведамленняў англійскага друку, італьянскія войскі 8 лістапада занялі Макале.

Італьянскія газеты толькі 8 лістапада паведамілі аб заняцці Макале, хоць італьянскія патрулі падышлі да горада яшчэ некалькі дзён назад.

Карэспандэнт аўстрыйскага агенцтва «Тэлеграфен компані» тэлеграфуе з Джыбуці, што італьянскія войскі з прычыны недахвату вады, а таксама невыноснага клімату і шматлікіх захворванняў салдат ачысцілі раён гары Муса-Алі (данакільскі фронт) і адступілі да Эрытрэі. Як вядома, раён гары Муса-Алі быў заняты італьянцамі ў самым пачатку іх наступлення на Абісінію і прадстаўляе сабой важны стратэгічны пункт.

Карэспандэнт брытанскага агенцтва «Эксчэйндж тэлеграф» пры італьянскай арміі на паўночным фронце паведамляе, што пасля заняцця Макале італьянцы занялі вёскі Эіда, Селасі і Шафат, размешчаныя за 12 міль на поўдзень ад Макале. Італьянская калона прасунулася далей у напрамку Шэлікот і Антало за 20 міль на поўдзень ад Макале.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Агенцтва Гаваса паведамляе, што італьянскія войскі на паўднёвым фронце занялі абісінскі горад **Гарахай.**

Рымская газета «Стампа» піша аб значных баях у раёне Уал-Уала. Паводле слоў газеты, абісінскія войскі атакавалі італьянскія пазіцыі. Атакуючыя, паводле сцвярджэння газеты, страцілі 3 500 забітымі і ранеямі. З боку італьянцаў дзейнічалі артылерыя і танкі. Сам факт баёў вакол Уал-Уала зварачае на сябе ўвагу, паколькі гэты пункт быў заняты італьянцамі яшчэ ў мінулым годзе. Як відаць, італьянцам прышлося пасля нядаўняга прасоўвання грунтоўна адступіць.

Згодна атрыманых вестак, войскі раса Доста перайшлі граніцу італьянскага Сомалі паміж Доло і ракой Вебе-Шэбелі і аперыруюць у кантакце з войскамі, якія знаходзяцца ў Імі (на верхнім цячэнні Вебе-Шэбелі).

Паводле вестак італьянскіх газет, тэрыторыя, занятая і кантралюемая італьянскімі войскамі ў Абісініі, складае каля 18.750 квадратных міль.

ШМАТЛІКІЯ МІТЫНГІ І ДЭМАНСТРАЦЫІ У РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ

МАЗЫР, 9 лістапада. **(Кар. «Звязды).** Не гледзячы на дрэннае надвор'е, ва ўсіх раённых цэнтрах Мазырскай акругі 7 лістапада адбыліся шматлікія мітынгі і дэманстрацыі, прысвечаныя XVIII гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У Мазыры на дэманстрацыю вышла каля 10 тысяч чалавек. На мітынгу, які адбываўся на Плошчы Волі, дэманстрантаў віталі кіраўнікі акруговых і раённых партыйных і совецкіх арганізацый.

Асабліва цікавай была калона равеснікаў Кастрычніка. У кожнага маладога дэманстранта на грудзях красавалася ганаровая лічба «18».

***

РАГАЧОЎ, 9 лістапада. **(Кар. «Звязды»).** Пролетарскае свята Рагачоўскі раён сустрэў вытворчымі перамогамі. Картонная фабрыка імя Сталіна датэрмінова выканала гадавы план. Выканалі сваю дзесяцімесячную праграму лесазавод імя Халтурына, райпромкамбінат, промарцель «Аб'яднанне» і іншыя. 16 калгасаў разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах сельскагаспадарчых паставак і плацяжах.

ні ранкома. У дэманстрацыі прынялі ўдзел звыш 15 тысяч працоўных Барысава.

—o—

СВЯТА НА ГРАНІЦЫ

КАПЫЛЬ, 9 лістапада. **(Кар. «Звязды»).** 7 лістапада ў раённым цэнтры адбылася трохтысячная дэманстрацыя рабочых, служачых і калгаснікаў, членаў прамарцелей і школьнікаў мястэчка. У в. Пясочнае 6 лістапада ўпершыню загарэлся лямпка Ільіча. Закончана будаўніцтва новых памяшканняў сельсавета і дома сацыялістычнай культуры. У пагранічным калгасе «Ільіч», Бабаўлянскага сельсовета, адбылося ўрачыстае адкрыццё калгаснага дома сацыялістычнай культуры ў каменным будынку.

фабрыкі.

За 5 год свайго існавання фабрыка выпусціла прадукцыі на 191.372 тысячы рублёў. Прыбытак фабрыкі за гэты час складае 33 мільёны рублёў.

Удзельнікі вечара паслалі пры-

выдатнікі атрымалі грашовыя ... мі. На вечары быў зачытаны ... гад Наркаммясцпрома аб ... родзе дырэктара фабрыкі т. ... лабкова 400 рублямі і тэхніт... дырэктара т. Пендзітава 750 р...

СУД

Крушэнне на станцыі Стальной Конь М.-Курскай чыгункі

6 кастрычніка машыніст таварнага поезда № 812 **Ноздрын,** не зварачаючы ўвагі на жоўтыя і чырвоныя сігналы светафораў, на закрыты семафор і сігналы астаноўкі, падаваемыя паязной брыгадай, уляцеў з вялікай скорасцю на ст. Стальной Конь М.-Курскай чыгункі і ўрэзаўся ў хвост балотнага поезда № 906. У рэзультаце сутычкі аказалася поўнасцю разбітымі 24 вагоны і пашкоджанымі 5 вагонаў. Нармальны двухпуцны рух быў адноўлены толькі праз 19 гадзін. Страты чыгункі ад крушэння — звыш 90 тыс. рублёў.

Справа аб гэтым крушэнні разглядалася ў Орле выязной сесіяй лінейнага суда М.-Курскай чыгункі.

Суд прыгаварыў да расстрэлу галоўнага віноўніка крушэння машыніста Ноздрына — з кулакоў, былога белагвардзейца (у 1919 г. ездзіў на бронепоездзе белых, расстрэльваўшым рабочых). Прыгавор выкананы.

СТАХАНАЎКА ІЛЬНАВОДСТВА М. Я. РАГОЎСКАЯ ПРЭМІРАВАНА НОВЫМ ДОМАМ

СЯННО, 8 лістапада. У ... 18 гадавіны Кастрычніка пра... нем калгаса імя **Тімірязева,** ... майцянскага сельсавета, ста... наўка ільнаводства **Марыя Яко...лоўна Рагоўская** прэміравана ... вым домам з двух пакояў.

Райвыканком у якасці падарку за свае сродкі зрабіў абліц... пакояў, купіў для Рагоўс... стол, шэсць венскіх крэслаў, ... напу і патэфон. **Ал. МАХНА...**

—o—

ПАВЕДАМЛЕННІ

Оргбюро Кагановіцкага РК ... з ЦК ВКП(б) 11 лістапада ў 7 гадз. вечара ў малой зале клуба імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай) склікаюць нараду ... жынераў, тэхнікаў і майстроў ... прыемстваў раёна па пытанню ... гортвання стахановскага руху.

***

Аддзел культуры і прапаганды ленінізма Менгаркома КП(б)Б паведамляе, што 10 лістапада ў 7 гадз. вечара ў клубе імя Сталіна адбудзецца нарада ўсіх прапагандыстаў, сакратароў парткомаў, парторгаў, парвічных арганізацый, загадчыкаў партбібліятэк па пытаннях: 1. Чытка пісьма аддзела партыйнай прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б). 2. Аб бліжэйшых тэмах заняткаў і размеркаванні падручнікаў.

Уваход па партбілетах.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІК.

XVIII ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ Ў МЕНСКУ.

ПАРАД У МЕНСКУ. Каля трыбуны праходзілі артылерыя, кавалерыя і пяхота. НА ЗДЫМКУ: кавалерыя праходзіць міма трыбуны. Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

Памяшканне БДТ-1	Бел. дзярж. тэатр ОПЕРЫ І БАЛЕТА
11 лістапада	БАЛЕТ
КАПЕЛІЯ	
Пачатак у 8 гадз. вечара.	
Білеты прадаюцца ў касе тэатра і ў рабочай касе.	
Абанементы са штампам «1 лістапада» сапраўдны на 11 лістапада.	

ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «Чырвоная зорка»	Сёння НОВАЯ ПРАГРАМА
ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «Пролетарый»	Гукавы мастацкі фільм ВАРОЖЫЯ СЦЕЖКІ
ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «Інтэрнацыянал»	Гукавы мастацкі фільм ГІБЕЛЬ ЭСКАДРЫ (Апошні порт)
КІНО СПАРТАК	Выдатны мастацкі фільм ЛЯСНАЯ БЫЛЬ

Менскі гарадскі аддзел народнай асветы

аб'яўляе

ПРЫЁМ СЛУХАЧОЎ на **адногадовыя курсы** па падрыхтоўцы **выкладчыкаў гісторыі, геаграфіі і літаратуры** для няпоўных сярэдніх школ.

Прымаюцца асобы з сярэдняй асветай. Стыпендыя ад 90 рублёў і вышэй, у залежнасці ад паспяховасці.

Кватэрай слухачы не забяспечваюцца.

Заявы прымаюцца да 17 лістапада г.г. у канцэлярыі 25-й базавай школы імя Чарвякова (Совецкая, 44) штодзённа ў 1—3 гадз. дня.

Да заявы прыкласці дакументы аб асвеце і соцпаходжанні.

Загадчык Менгарана КУЗНЯЦОВА.

ЗГУБЛЕНЫ І ЎКРАДЗЕНЫ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДЫМІ:

Шымко А. А. — метрычны выпіс, Зайчанкаў С. П. — пашпарт, Шлопскі Б. Ш.—І. — вайсковы білет, Темрук І. І.—пашпарт, Ксенафонтаў П. І.—пашпарт, Чэртко І. П.—комсамольскі білет, Грынкевіч Г. П.—вайсковы білет і пашпарт, Трэгубовіч Г. Г.—вайсковы білет, Маеўскі К. Ф.—прафбілет, Фрайман Д. А.—пашпарт, Кірнужыцкая Я. С.—пашпарт.

Друкарні газ. **„ЗВЯЗДА“**

патрэбны

вучні-лінатыпісты.

Адукацыя не ніжэй 7-годкі.

Зварачацца: Совецкая, 63 2-гі паверх да дырэктара.

МЕСЯЧНІК ТЭХНІКІ

У доме тэхнікі (Комсамольская, 25)

СЁННЯ, 10 лістапада, у 7 гадзін вечара — даклад дырэктара завода «Фрэзер» т. **Троцкага Г. Р.** на тэму **«Развіццё інструментальнай прамысловасці ў СССР, Германіі і Амерыцы».**

СЁННЯ, 10 лістапада, у 7 гадзін вечара — даклад дацэнта Маскоўскага торфінстытута т. **Блюменберга В. В.** на тэму **«Тэхназаканамічнае параўнанне спосабаў торфаздабычы».**

ЗАЎТРА, 11 лістапада, у 7 гадзін вечара — даклад загадчыка аддзелам хромскуры цэнтральнага навукова-даследчага інстытута скуранай прамысловасці інжынера **Касценка А. С.** на тэму **«Праблема утылізацыі бракованай сыравіны ў скуранай прамысловасці».**

Запрашаюцца інжынерна-тэхнічныя работнікі, гаспадарнікі, выдатнікі і вынаходнікі. **ОРГКАМІТЭТ.**

ПЕДГАБІНЕТ МЕНГАРАНА

СЁННЯ, 10 лістапада, у 8 гадзін вечара, для выкладчыкаў фізікі — лекцыя дацэнта **Сірачынскага** на тэму: «Работа і энергія».

Для выкладчыкаў беларускай літаратуры—даклад навуковага работніка **Галубка.**

Для настаўнікаў 1 і 2 класаў — семінар па каліграфіі.

Тыраж 97.575 экз.

Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела № К—4484.